«АНІМАЕЎКА» ПРОЙДЗЕ Ў МАГІЛЁВЕ 5





У ПАНЯДЗЕЛАК ПЕРШЫЯ ЗАМАРАЗКІ? 16

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

+TV ПРАГРАМА

20 ВЕРАСНЯ 2024 г. ПЯТНІЦА № 184 (30318)

## КОРАТКА

• Сумеснае пасяджэнне Палаты прадстаўнікоў і Савета Рэспублікі адбудзецца 25 верасня.

• **Мінадукацыі вызначыла навучальныя прадметы выніковых іспытаў у 9-х і 11-х класах. Асноўныя тэрміны правядзення іспытаў — з 2 да 13 чэрвеня 2025 года, іншыя — з 18 да 25 жніўня 2025 года.**

• Мошчам Ефрасінні Маскоўскай 2—4 кастрычніка можна пакланіцца ў Свята-Раждаство-Багародзічным манастыры ў Гродне.

• **Новае абсталяванне для даследавання гаджэтаў атрымалі брэсцкія эксперты. Яно пашырае магчымасці пры правядзенні экспертызы радыёэлектронных устройстваў для атрымання інфармацыі з мабільных тэлефонаў, планшэтаў, карт памяці.**

• Конкурс пілотных праектаў для IT-кампаній у сферы лічбавага землякарыстання і стварэння землеўпарадчых і землеробства аб'явіў Мінсельгасхарч.

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «Гэта ўжо, будзем шчыра казаць, поле бою»

## Які галоўны стандарт правядзення выбараў

**Мінск прымае пасяджэнне Кансультатыўнага савета кіраўнікоў выбарчых органаў дзяржаў — удзельніц СНД. На парадку дня — аналіз нядаўніх электаральных кампаній, метадалогія міжнароднага назірання за выбарамі, работа з моладдзю. Акцэнты, на якія варта звярнуць увагу, падчас сустрэчы з членамі Кансультатыўнага савета расставіў і Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка.**



Фота БелТА.

Вітаючы гасцей у Палацы Незалежнасці, кіраўнік дзяржавы падзяліўся ўспамінам са свайго багатага досведу: «Я ўспамінаю перыяд, калі органы, якія вы ўзначальваеце, толькі ствараліся. Скажу шчыра, гэта і ёсць добры, станоўчы прадукт дэмакратыі і дэмакратызацыі нашага грамадства ў тыя часы. Мы доўга спрачаліся, трэба нам выбарчыя камісіі ці не трэба, вывучалі досвед іншых краін, дзе, напрыклад, і Міністэрства ўнутраных спраў можа кантраляваць, і арганізоўваць, і рабіць адпаведныя заключэнні па выбарах. Але, ідучы дэмакратычным шляхам, мы стварылі нашы выбарчыя камісіі, вертыкаль ад цэнтральнай да адпаведных раённых акруг і гэтак далей. І гэта той выпадак, калі мы не памыліліся. Мы тады не маглі падумаць, што ваша дзейнасць, зона адказнасці, тая пляцоўка, на якой вы ў органах улады знаходзіцеся, стане такім полем баявых дзеянняў, у якіх вы часта змагаецеся. І, дзякуй богу, не заўсёды ў адзіночку. Тым не менш вам хапае».

### Шукаць унутраныя прычыны

«Электаральныя кампаніі ўжо даўно перасталі быць тэхнічнай працэдурай. Гэта ўжо, будзем шчыра казаць, поле бою ў перадвыбарны і выбарны перыяды, дзе галоўнай дзеючай асобай з'яўляюцца органы Цэнтральнай выбарчай камісіі і выбарчыя камісіі ўвогуле. Сёння выбары — адна з галоўных, калі не галоўная палітычная падзея ў жыцці любой краіны. Асабліва ў нас. Я думаю, час нам пераставаць удзяляць такую сур'ёзную ўвагу і надаваць такое значэнне выбарам. Звычайны павінен быць палітычны працэс», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Ён адзначыў, што якасная падрыхтоўка да выбараў, празрыстасць і сумленнасць гарантуюць падтрыманне палітычнай стабільнасці, захаванне міру і парадку ў грамадстве. «У гэты перыяд кожнае слова з вашых вуснаў вельмі сур'ёзна ўспрымаецца. І народы нашы прывыклі верыць у тое, што кажа старшыня Цэнтральнай выбарчай камісіі і падпарадкаваныя яму структуры», — адзначыў Прэзідэнт. Ён заўважыў, што апаненты ўлады спрабуюць выкарыстоўваць электаральны перыяд ва ўласных інтарэсах. Калі не атрымліваецца спакойна, то выкарыстоўваюць вядомыя рэвалюцыйныя і нерэвалюцыйныя мяцежныя метады, каб супрацьдзейнічаць уладзе. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што ўсе краіны СНД былі падвергнуты такім выпрабаванням, Беларусь у тым ліку ў 2020 годзе. «Але мы заўсёды шчыра, адкрыта прызнавалі: не бывае так, што з-за мяжы на нас нацыснулі — і мы пачынаем хістацца, і ў нас хтосьці па вуліцах пачынае снаўдацца. Значыць, ёсць і ўнутраныя прычыны. Мы гэтыя прычыны ведаем, мы іх вызначылі і зрабілі адпаведныя высновы, вынеслі ўрокі з тых падзей, каб не паўтарылася зноў», — сказаў ён.

СТАР. 2

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Пётр МІКЛАШЭВІЧ, старшыня Канстытуцыйнага Суда:**

*«Прэзідэнтам была пастаўлена задача правесці рэвізію заканадаўства, гэта значыць, усіх нарматыўных прававых актаў, прынятых на падзаконным узроўні. У Канстытуцыйным Судзе цяпер вядзецца актыўная работа: праводзіцца аналіз заканадаўства, прынятага на падзаконным узроўні ва ўсіх сферах жыццядзейнасці грамадства і дзяржавы. Выявіліся некаторыя канцэптуальныя пытанні, якія патрабуюць вырашэння на дзяржаўным узроўні. Што да самога прынцыпу законаў, то гэты працэс у нас упарадкаваны».*

Парламенцкі дзённік

# ПАТРАБАВАННІ СПРОШЧАНЫ, АДКАЗНАСЦЬ ПАВЫШАНА

## Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў абмеркавалі развіццё будаўнічай галіны

**Сумесныя пасяджэнні пастаянных камісій парламента з прадстаўнікамі галіновых міністэрстваў і ведамстваў — неад'емная частка работы над законапраектамі. Яны дазваляюць даскапальна разгледзець змяненні, якія прапануюцца да ўнясення, пачуць меркаванні тых, каму непасрэдна давядзецца працаваць з новымі законамі. Але ж не толькі на гэтай стадыі дэпутаты сустракаюцца з чыноўнікамі і работнікамі вытворчасці. Яшчэ адна мэта — аналіз дзеяння і эфектыўнасці ўжо прынятых законаў.**

Адно з такіх пасяджэнняў было прысвечана Кодэксу аб архітэктурнай, горадабудаўнічай і будаўнічай дзейнасці, які набыў сілу ў ліпені гэтага года. Члены Пастаяннай камісіі па жыллёвай палітыцы, гандлі і будаўніцтве на чале з Юрыем Наркевічам сустрэліся з намеснікам міністра архітэктуры і будаўніцтва Аляксандрам Шваюновым. Яны абмеркавалі прамежкавыя вынікі работы будаўнічай галіны, як адбіўся на дзейнасці будаўнікоў кодэкс, а таксама агучылі пытанні, з якімі сутыкаюцца грамадзяне і будаўнічыя арганізацыі ў іх акругах.

СТАР. 3

Прафарыентацыя

# «Нашы студэнты — мэтанакіраваныя і ўпэўненыя ў сваім выбары»



**Аграрная галіна нашай краіны прыкметна памаладзела: кожны год у гаспадаркі прыходзяць некалькі тысяч маладых працаўнікоў. Сістэма аграрнай адукацыі таксама не стаіць на месцы, бо, каб кіраваць сучаснымі камбайнамі і беспілотнікамі, настройваць параметры ў сховішчах для агародніны і ладзіць работу малочнатаварных комплексаў, пераводзіць у лічбавы варыянт тэхналагічныя працэсы, патрэбны прафесіяналы. Як падрыхтаваць такіх спецыялістаў, якія метады і тэхналогіі навучання зробяць выпускнікоў ВНУ запатрабаванымі на вытворчасці? Аб гэтым і іншым размова з рэктарам Беларускага дзяржаўнага аграрнага ўніверсітэта Мікалаем РАМАНЮКОМ.**

СТАР. 4

ISSN 1990 — 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

СА «ЗВЯЗДОЙ» ЦЯПЛЕЙ І ЎТУЛЬНЕЙ!

Ідзе падпіска на IV квартал 2024 года.

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ ВОСЕННЮ І ЗІМОЙ. БУДЗЕ ЦІКАВА!

# «Гэта ўжо, будзем шчыра казаць, поле бою»

### «Нам трэба дзейнічаць разам»

Прэзідэнт адзначыў, што ў Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі, якая была нядаўна прынята на Усебеларускім народным сходзе, замацаваны тэрмін «электаральны суверэнітэт». «Размова ідзе аб абароне нашых нацыянальных інтарэсаў, неад'емным праве дзяржавы праводзіць выбары і рэферэндумы без агляды на водгукі і ціск звонку, — растлумачыў ён. — Мы, тым не менш, з нашымі партнёрамі, сябрамі, з вамі, найперш з краінамі СНД гатовы абмяркоўваць напрацоўкі па ўдасканаленні нашага заканадаўства і забеспячэнні бяспекі выбарчага працэсу».

Аляксандр Лукашэнка назваў вельмі важным існаванне такой міжнароднай пляцоўкі, як Кансультатыўны савет, які стаў месцам эфектыўнага ўзаемадзеяння напярэдадні электаральных кампаній і ўвогуле ў жыцці. «Я не раз казаў, што ў гэтай сферы нам трэба дзейнічаць разам, выпрацоўваць агульныя прынцыпы дзейнасці нашых цэнтральных камісій, распрацоўваць законы, падзаконныя акты і практыку напрацоўваць, каб у нас не было вялікіх разыходжанняў. Трэба вывучаць і сусветны досвед. Наўрад ці мы там штосьці запазычым, напэўна, мы ўжо ўсё вывучылі і прынялі ў сябе дома адпаведныя рашэнні.

Важна распрацоўваць уласныя стандарты. Галоўны стандарт, якога мы заўсёды прытрымліваемся, — гэта не тое, як нам навязжуць нейкія прынцыпы па панясцях з боку АБСЕ ці яшчэ нейкіх арганізацый, а тое, наколькі нашы законы і падзаконныя акты будуць адпавядаць Канстытуцыі. І наколькі выбары будуць адпавядаць таму заканадаўству, якое прынята ў нашых краінах. Гэта галоўнае», — сказаў ён.

### Беларускі народ павінен сам вызначыць, хто будзе ўзначальваць дзяржаву

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што Беларусь ужо ўступіла ў перадэлектаральны перыяд, хутка будуць прэзідэнцкія выбары. «Мы зыходзім менавіта з гэтых прынцыпаў: беларускі народ павінен сам вызначыць, без усялякага ціску, хто будзе ўзначальваць краіну», — заявіў беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што Беларусь ніколі не была супраць міжнароднага назірання за правядзеннем выбараў. А назіральнікам з СНД і ўвогуле заўсёды рады. Пасля прызначэння даты прэзідэнцкіх выбараў 2025 года назіральнікам з СНД будуць адпраўлены запрашэнні. «Для нас вельмі важна ваша сяброўская парада, заўвага ці нават крытыка намі ўспрымаюцца ўсур'ёз», — расказаў кіраўнік дзяржавы. Па яго словах, пакуль не вызначыліся, што рабіць з іншымі замежнымі назіральнікамі. Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што яны прыязджаюць з ужо загадзя падрыхтаванымі дакументамі, якія потым падпісваюць і агучваюць. Ён расказаў, што ў мінулую электаральную кампанію спецслужбам быў вядомы змест гэтых дакументаў яшчэ да пачатку выбараў. «Іх не цікавіць гэты працэс. Яны загадзя вызначылі тон, што яны будуць рабіць у нашай краіне, і выніковую заяву», — заўважыў беларускі лідар. Канчатковае рашэнне па міжнародных назіральніках будзе прымацца і з улікам парад партнёраў па СНД, і Расійскай Федэрацыі, як бліжэйшага саюзніка. «Нам, канешне, хацелася б, каб яны ўбачылі і расчараваліся ў тым меркаванні, з якім яны прыедуць да нас. Але мы не можам дапусціць, каб яны зноў прыехалі з талмудамі сваімі і зрабілі адпаведныя заявы, якія ўжо былі падрыхтаваны і напісаны не іх рукой», — заявіў беларускі лідар.

### Вельмі важна, каб грамадзяне давяралі вынікам выбараў

Аляксандр Лукашэнка зрабіў акцэнт, што сёння пры правядзенні выбараў немалаважна і гарантаваць бяспеку выбарнага працэсу. «І вельмі важна, каб пасля выбараў грамадзяне давяралі выбарчаму працэсу і вынікам выбараў у той ці іншай краіне», — заўважыў ён. Асаблівую ўвагу, па словах кіраўніка дзяржавы, варта ўдзяляць моладзі. Ён адзначыў, што трэба трымаць у полі зроку палітычную адукаванасць моладзі. «Моладзь з'яўляецца, і гэта не сакрэт, асноўным вулічным інструментам каляровых рэвалюцый. Таму асаблівую ўвагу мы ўдзяляем моладзі. Таму неабходна шукаць кропкі судакранання з маладымі выбаршчыкамі, і, калі ў вас ёсць такі досвед — а я перакананы: ён ёсць, — вы падзеліцеся сваімі напрацоўкамі і ведамі», — падкрэсліў беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка выказаў упэўненасць, што ўзаемадзеянне цэнтральных выбарчых органаў краін СНД дазволіць паспяхова вырашаць нават самыя складаныя задачы і праблемы. «Мне б вельмі хацелася, каб мы і надалей захавалі такое дзелавое супрацоўніцтва ў перадэлектаральны і электаральны перыяд і не толькі, якое склалася паміж цэнтральнымі выбарчымі камісіямі. Гэта дарагога варта. Гэта нельга страціць», — падсумаваў Прэзідэнт.

Старшыня Цэнтральнай выбарчай камісіі Беларусі Ігар Карпенка адзначыў, што паміж выбарчымі органамі на прасторы СНД выбудавана эфектыўнае ўзаемадзеянне як у рамках Кансультатыўнага савета, так і ў двухбаковым парадку. Выбудавана шчыльнае супрацоўніцтва ў рамках назірання за электаральнымі кампаніямі, якія праходзяць у краінах СНД. «Тут мы кіруемся выключна прынцыпамі аб'ектыўнасці, бесстароннасці, павагі суверэнітэту. Ва ўмовах шчыльнага міжнароднага супрацоўніцтва мы ацэньваем электаральныя кампаніі, якія адбываюцца ў розных краінах. Такая ацэнка абапіраецца ў першую чаргу на нормы Канвенцыі аб стандартах дэмакратычных выбараў, выбарчых правоў і свабод у дзяржавах — удзельніцах СНД. Гэта ўнікальны дакумент, які ратыфікаваны нашымі нацыянальнымі парламентамі. І, вядома ж, суадносім гэта ў першую чаргу з нацыянальным заканадаўствам кожнай краіны», — расказаў ён.

Ігар Карпенка заўважыў, што змяненні ў Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь, прынятыя на рэспубліканскім рэферэндуме ў 2022 годзе, далі пачатак маштабнай палітычнай мадэрнізацыі нашай краіны. «Кіруючыся абноўленым заканадаўствам, мы ў адзіны дзень галасавання выбралі дэпутатаў усіх узроўняў. Акрамя гэтага, выбарчы цыкл працягваўся практычна да канца красавіка. Як вы ведаеце, мы выбралі членаў Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу, дэлегатаў Усебеларускага народнага сходу. І гэты новы канстытуцыйны орган стаў працаваць у поўным аб'ёме. Электаральны цыкл ва ўмовах канстытуцыйных рэформ завершаць выбары Прэзідэнта ў 2025 годзе», — расказаў калегам Ігар Карпенка.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

# «У АСНОВЕ НАШАГА СЯБРОЎСТВА І СУПРАЦОЎНІЦТВА — ТОЛЬКІ МІР»

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка сустрэўся з кіраўніком Данецкай Народнай Рэспублікі Дзянісам Пушыліным. «Мы супрацоўнічаем даўно. А што датычыцца Беларусі, то ў складзе Украіны мы заўсёды супрацоўнічалі з Данецкай вобласцю. І, натуральна, у гэты складаны перыяд з тых яшчэ часоў (ужо 10 гадоў) мы не адмаўляліся ад гэтага супрацоўніцтва, гатовыя працягваць і цяпер. Тым больш што пэўныя напрацоўкі ёсць, база створана», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.**

Аляксандр Лукашэнка зрабіў акцэнт на тым, што ў гэтым супрацоўніцтве трэба пазбаўляцца ад пасрэднікаў, на што беларускі бок, безумоўна, гатовы.

«Тут у нас розныя намёкі і іншае, нават з Захаду, што вы вось будзеце супрацоўнічаць, пакрыўдзіце Украіну. Мы нікога не крыўдзім. Мы гатовы супрацоўнічаць і з Украінай на тых жа прынцыпах, што і з Данецкай Рэспублікай, — заявіў Прэзідэнт. Ён заўважыў, што Беларусь прымае на лячэнне і аздараўленне дзяцей з ДНР. Яны вельмі задаволеныя. «Праўда, мяне ледзь у суд нейкі не зацягнулі, што мы крадзём, аказваецца, вашых дзяцей. Ну, дык я прапанаваў і Украіне, і амерыканцам: калі ласка, прыязджайце, знайдзіце хоць адно ўкрадзенае дзіця. Гэта не нашы прынцыпы», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Ён пацвердзіў, што Беларусь гатова супрацоўнічаць з ДНР, абсалютна не парушаючы ніякія міжнародныя нормы і нормы нашых узаемаадносін. «Мы працуем у імя людзей. Ёсць праблема ў будаўніцтве ў вас — мы будзем вас падтрымліваць і вам дапамагаць. Ёсць у вас праблема кагосьці лячыць, адукацыю атрымаць — мы гатовы з вамі супрацоўнічаць. Абсалютна на такіх прынцыпах гатовы супрацоўнічаць і з Украінай. Таму не трэба тут на нас накатваць, навальваць. Мы людзі міралюбівыя. У аснове нашага сяброўства і супрацоўніцтва — толькі мір», — канстатаваў беларускі лідар. Ён падкрэсліў, што ў ДНР могуць разлічваць на Беларусь, калі ўбачаць у краіне нешта неабходнае для аднаўлення і развіцця свайго краю.

Дзяніс Пушылін ад імя жыхароў ДНР і сябе асабіста падзякаваў Аляксандру Лукашэнку за ўсебаковую дапамогу, у першую чаргу гуманітарнага характару. «У нас вельмі шмат пунктаў судакранання. І гэта не толькі агульная гісторыя, але і бачанне далейшага развіцця. Гэта толькі моцнае, шчаслівае грамадства, заснаванае на справядлівасці. І наша задача — выбудаваць такія ўмовы, каб не сорамна было перадаць наступным пакаленням. Дзякуй вам», — сказаў ён.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

### У тэму

## СТВОРАНА БАЗА ДЛЯ СУПРАЦОЎНІЦТВА

Журналістам **Дзяніс ПУШЫЛІН** расказаў, што ў эканамічным і гуманітарным супрацоўніцтве Беларусі і ДНР ужо створана база для наступных крокаў. Па яго словах, найперш размова ідзе аб гуманітарным складніку — арганізацыі адпачынку дзяцей з Данбаса. «Ёсць магчымасць узаемадзеяння па маладзёжным кірунку. Ужо прайшло некалькі форумаў у Беларусі і Расійскай Федэрацыі, і яны прыносяць пэўны эфект. Аднагодкі адзін аднаго разумеюць значна хутчэй. Нашым маладым людзям ёсць што расказаць, расказаць у параўнанні, як гэта бывае, што нясе псеўдадэмакратыя, якая навязвалася, што нясуць тыя «каштоўнасці» і ў што гэта выліваецца», — адзначыў Дзяніс Пушылін.

Эканамічнае супрацоўніцтва таксама набірае абароты. Дзяніс Пушылін расказаў, што на тэрыторыі ДНР ідзе грандыёзная будоўля, і ў ДНР у сувязі з гэтым ёсць пэўныя патрэбы, у тым ліку ў будаўнічай і камунальнай тэхніцы. «Неабходна і рамонтная база, таму што на нашых кар'ерах засталася тэхніка БЕЛАЗ, яна патрабуе рамонту. Рэспубліка Беларусь гатова аказаць садзейнічанне ў рамонтна-тэхнічным забеспячэнні, і гэта пункт узаемавыгаднага супрацоўніцтва», — заявіў Дзяніс Пушылін. Яшчэ адзін важны пункт супрацоўніцтва — пастаўка ў ДНР беларускіх прадуктаў харчавання. Тут таксама ёсць попыт, гэта работа сістэматызуецца.

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Прамыслоўцы Германіі папярэджваюць аб дэіндустрыялізацыі краіны



Пра гэта паведаміў Германскі прамысловы саюз (BDI) па выніках даследавання, якое па яго замове правялі кансалтынгавая кампанія Boston Consulting Group і Інстытут германскай эканомікі (IW). «Рызыка дэіндустрыялізацыі з-за ціхай міграцыі прадпрыемстваў і стану многіх сярэдніх кампаній пастаянна ўзрастае і ўжо рэалізоўваецца», — заявіў прэзідэнт BDI Зігфрыд Русвурм. Паводле яго слоў, Германія перастае быць прывабным месцам для вядзення бізнесу з-за сукупнасці структурных праблем, і праграмы хуткага стымулявання эканомікі тут не дапамогуць. «Палітычны мікраменеджмент і адсутнасць жадання рэфармаваць рынкавую эканоміку паралізуюць кампаніі», — канстатуюць у BDI. Згодна з высновамі даклада, каб пераламаць сітуацыю і захаваць канкурэнтаздольнасць, да 2030 года Германіі спатрэбяцца прыватныя і дзяржаўныя інвестыцыі ў памеры 1,4 трлн еўра. Асобнай пагрозай эканомікам Германіі і ЕС з'яўляецца закрыццё еўрапейскіх аўтамабільных заводаў з-за няздольнасці пакрыць каласальныя інвестыцыі ў пераходзе на электрамабілі.

### На французскай Марцініцы з-за беспарадкаў увялі каменданцкую гадзіну



Адзначаецца, што на востраве — французскай заморскай тэрыторыі ў Карыбскім моры — падчас пратэстаў супраць падаражання харчавання, якія працягваюцца ўжо некалькі дзён, былі паранены шэсць паліцэйскіх. Каменданцкая гадзіна дзейнічае ў партовай зоне, а таксама ўздоўж дарог ад навакольнага гіпермаркета ў раёне Дыён да раёна Жамбет у горадзе Фор-дэ-Франс. Аб гэтым паведаміла РІА «Новости» са спасылкай на радыёстанцыю France Info. На востраў прыбудзе падмацаванне з праваахоўнікаў Французскай Гвіяны і Гвадэлупы, іншых заморскіх рэгіёнаў Францыі. Гарадскі порт, праз які праходзяць амаль усе пастаўкі тавараў, стаў цэнтрам пратэстнага руху з пачатку верасня. Па выходных пратэстоўцы таксама блакуюць супермаркеты вострава па закліку Руху па абароне насельніцтва і рэсурсаў афра-карыбскай тэрыторыі. Як вядома, у маі масавыя пратэсты таксама праходзілі на іншай французскай заморскай тэрыторыі — Новай Каледоніі.

### Оперу «Багема» скарацілі для пакалення «ціктокераў»



Скарочаная версія «Багемы» ўпершыню была пастаўлена ў італьянскім горадзе Перуджа — яна доўжыцца 90 хвілін замест 160. Пра гэта паведаміла Euronews. Прапанаваў паставіць оперу «Багема» ў скарочаным выглядзе тэнар Джанлука Тэранава, ён таксама выконвае галоўную мужчынскую ролю Радольфа. Мэтавай аўдыторыяй новай кароткай версіі «Багемы» з'яўляюцца дзеці пакалення Z. Опера была скарочана на гадзіну, каб улічыць паніжаную працягласць увагі пакалення TikTok. Яна доўжыцца столькі ж, колькі футбольны матч без авертайму. «Гэта спосаб наблізіць аўдыторыю TikTok да оперы», — адзначыў Тэранава.

# ПАТРАБАВАННІ СПРОШЧАНЫ, АДКАЗНАСЦЬ ПАВЫШАНА



Фота БелТА.

## ТЭНДЭНЦЫІ — СТАНОЎЧЫЯ

На пачатку пасяджэння Аляксандр Шваюноў пазнаёміў дэпутатаў са станам спраў у галіне. Ён адзначыў, што сёлета арганізацыі будкомплексу краіны захоўваюць асноўныя станоўчыя тэндэнцыі мінулых гадоў і павялічваюць долю галіны ў структуры ВУП. Так, па выніках студзеня—ліпеня яна склала 5,1 % і павялічылася на 1,7 працэнтнага пункта ў параўнанні з пачаткам года. Такім чынам, тэмп росту валавой дабаўленай вартасці па секцыі «Будаўніцтва» вырас на 9,5 працэнтнага пункта, а ўклад у фарміраванне ВУП павялічыўся на 0,4 працэнтнага пункта.

Сярод галоўных задач, якія стаяць перад галіной, намеснік міністра назваў загрузку вытворчых магутнасцяў і адзначыў, што яна паспяхова вырашаецца. Прырост аб'ёмаў вытворчасці забяспечаны як на менавіта будаўнічых пляцоўках (тэмп росту падрадных работ за студзень—ліпень склаў 109,5 %), так і на прадпрыемствах будындустрыі (індэкс фізічных аб'ёмаў склаў — 105,9 %, у тым ліку па арганізацыях, падведамасных МАіС, — 106,1 %). У цэлым зацверджаны ўрадам графік па росце падрадных работ выконваецца з апярэджаннем. Таксама як станоўчы момант Аляксандр Шваюноў адзначыў, што прадукцыйна працуюць арганізацыі ўсіх форм уласнасці: тэмп выканання падрадных работ па арганізацыях рэспубліканскай формы ўласнасці склаў 118,3 %, камунальнай — 110,7 %, прыватнай — 108,9 %.

Спыніўся намеснік міністра і на жыллёвым будаўніцтве. Паводле яго слоў, у 2021—2023 гадах заданне па агульным уводзе жылля перавыканана на 102,5 %, у рэспубліцы пабудавана і ўведзена ў эксплуатацыю больш як 12,8 млн кв. метраў. Станоўчая дынаміка захоўваецца і ў гэтым годзе: за сем месяцаў уведзена 1,9 млн кв. метраў, або 66,7 працэнта да задання на 9 месяцаў.

Забяспечанасць насельніцтва жыллём на пачатак года склала 29,9 кв. метра на аднаго жыхара пры ўстаноўленым на канец 2025 года параметры — 28,5 кв. метра. Між іншым, па гэтым паказчыку Беларусь займае адну з лідарскіх пазіцый сярод краін СНД. Так, у Расіі ён складае 28,8 кв. метра на чалавека, а ў Казахстане — 23,9 кв. метра.

## ЗНЕШНІ ВЕКТАР

Па словах намесніка міністра, у сучасных умовах для стабільнай дзейнасці галіны недастаткова ўтрымліваць пазіцыі на базавых рынках — трэба максімальна развіваць знешнегандлёвыя сувязі. На гэта нацэлены літаральна ўвесь будаўнічы комплекс.

І ёсць добрыя вынікі. Так, за першае паўгоддзе экспарт будаўнічых, інжынерных і архітэктурных паслуг у цэлым па краіне склаўся на ўзроўні 366,5 млн долараў ЗША, або 108,1 %. Асноўным стратэгічным партнёрам традыцыйна застаецца Расійская Федэрацыя (83 % ад агульнага экспарту паслуг). Асабліва важна тое, што на сёння нашы будаўнікі працуюць ужо ў больш як 70 рэгіёнах Расіі. Такому цеснаму ўзаемадзеянню спрыяе і аўтарытэт айчынных бударганізацый, бо ўсе ведаюць: калі зроблена беларусамі, то гэта заўжды якасна і надзейна. Ці то сацыяльныя або вытворчыя аб'екты, ці то жыллёвае будаўніцтва.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

## ЗБАЛАНСАВАНАСЦЬ І ФІНАНСАВАЯ ЎСТОЙЛІВАСЦЬ

Як адзначыў Аляксандр Шваюноў, на сёння ў галіне збалансаваны ўсе задзейнічаныя рэсурсы і тым самым павышаны ўзровень яе фінансавай устойлівасці. Так, па выніках першага паўгоддзя будаўнічы комплекс забяспечыла прыбытковая і рэнтабельная работа: прыбытак ад рэалізацыі склаў 761,4 млн рублёў (тэмп росту 139,1 %), рэнтабельнасць продажу — 9,1 %, атрыманы чысты прыбытак у памеры 511,3 млн рублёў (тэмп росту 164,5 %). Дзякуючы гэтаму, скарацілася колькасць стратных арганізацый і на 29,7 % павысілася сярэдняя заработная плата па секцыі «Будаўніцтва».

Дасягнуць добрых вынікаў дапамагло і развіццё будаўнічай вытворчасці. Рэалізаваны шэраг захадаў па павелічэнні долі айчыннай будаўнічай прадукцыі пры ўзвядзенні аб'ектаў у краіне, цяпер гэта каля 90 %. З апярэджаннем вытворчай праграмы выпускаюцца базавыя будаўнічыя матэрыялы: заданне па вытворчасці цэменту перавыканана на 9,5 %, тары са шкла — на 10,2 %, паліраванага шкла — на 54 %.

Паводле слоў намесніка міністра, рост прамысловай вытворчасці і паляпшэнне якасці прадукцыі, што выпускаецца, забяспечваецца, у тым ліку, і за кошт стварэння новых і правядзення мадэрнізацыі дзеючых вытворчасцяў, пашырэння асартыменту прадукцыі. Яскравыя прыклады такой работы — ААТ «Гродзенскі шклозавод», ААТ «Керамін», ААТ «Бярозабудматэрыялы»...

Ён таксама заўважыў, што на найбліжэйшую перспектыву плануецца рэалізацыя праектаў па мадэрнізацыі вытворчасці цеплаізаляцыйных матэрыялаў (каменнай ваты, шклаваты), пашырэнні асартыменту керамічнай пліткі за кошт асваення вытворчасці керамічных панэляў. Акрамя таго, запланаваны будаўніцтва завода па вытворчасці кальцыніраванай соды прадукцыйнасцю 300 тыс. тон у год, а таксама арганізацыя выпуску штучнага гіпсавага каменю на аснове фосфагіпсу для атрымання партландцэменту на аснове адходаў вытворчасці ААТ «Гомельскі хімічны завод».

Такім чынам высокая якасць і даступнасць айчынных будматэрыялаў дае магчымасць арганізацыям галіны канкурыраваць на знешніх рынках. Сярэдняе значэнне долі замежных паставак у аб'ёмах вытворчасці складае каля 40 %, а па шэрагу прадпрыемстваў керамічнай і шкляной падгалін — да 70 %. Наша шкляная прадукцыя, напрыклад, запатрабавана ў больш як 20 краінах, керамічная — у больш як 10, гадавы аб'ём экспарту цэменту перавышае 2,2 млн тон.

## А ШТО З РАБОТНІКАМІ?

Гаворачы пра кадравы патэнцыял галіны, Аляксандр Шваюноў канстатаваў, што на дадзены момант назіраецца пэўны разрыў паміж патрэбамі будаўнічай сферы і магчымасцямі адукацыйных устаноў. Ёсць пытанні да падрыхтоўкі кадраў, прафарыентацыйнай работы і паляпшэння іміджу прафесіі будаўніка. Вырашэнне існуючых праблем бачыцца ў сістэмным да іх падыходзе і ўзаемадзеянні міністэрства з установамі адукацыі, галіновым прафсаюзам, Рэспубліканскім саюзам будаўнікоў. Пры гэтым, па словах чыноўніка, на ўзроўні кіраўніка дзяржавы, урада і Мінбудархітэктуры, галіновага прафсаюза прынята дастаткова мер па замацаванні кадраў у будаўнічай галіне.

І гэта дае свой плён: за студзень—ліпень гэтага года колькасць занятых у будаўнічай галіне павялічылася на 6,5 тысячы чалавек (да 118,7 тысячы работнікаў). У мэтах замацавання ў будаўнічых арганізацыях кваліфікаваных кадраў і недапушчэння іх адтоку прымаюцца меры па павышэнні ўзроўню заработнай платы. Дарэчы, сёння ў параўнанні з іншымі відамі дзейнасці будгаліна па ўзроўні заработнай платы займае пятае месца.

Відавочна, што новыя задачы, якія стаяць перад будаўнічым комплексам, патрабуюць і новых падыходаў да падрыхтоўкі спецыялістаў. Патрэбна таксама пашырэнне кваліфікацыйных патрабаванняў, якія адпавядаюць сучасным тэхналагічным тэндэнцыям. Таму з мэтай актуалізацыі прафесійна-кваліфікацыйнай структуры галіны зацверджаны 23 прафстандарты і распрацаваны пяць новых. Сумесна з профільнымі ўстановамі адукацыі вырашаецца пытанне падрыхтоўкі кваліфікаваных практыка-арыентаваных кадраў, у тым ліку з уцягваннем вопытных спецыялістаў-будаўнікоў у адукацыйны працэс. Падрыхтавана адпаведная дарожная карта, асноўны ўпор у якой зроблены на мэтавую падрыхтоўку.

## ЗНАКАВАЯ ПАДЗЕЯ ДЛЯ ГАЛІНЫ

Менавіта так абазначыў Аляксандр Шваюноў уступленне ў дзеянне Кодэкса аб архітэктурнай, горадабудаўнічай і будаўнічай дзейнасці, які абагульніў асноўныя дакументы, што рэгламентуюць парадак узвядзення будынкаў і збудаванняў на ўсіх стадыях: ад ідэі да прыёмкі ў эксплуатацыю.

Вялікае значэнне мае тое, што навацыі спрасцілі патрабаванні да ўсіх удзельнікаў будаўнічага працэсу і адначасова павысілі іх персанальную адказнасць. Сярод важкіх момантаў намеснік міністра назваў наступныя:

— надзяленне мясцовых органаў улады правам узгаднення размяшчэння аб'ектаў з адступленнямі ад горадабудаўнічай дакументацыі, зацвярджэння генпланаў гарадоў абласнога падпарадкавання, што дае магчымасць істотна скараціць дакументаабарот і тэрміны выхаду інвестара на будпляцоўку;

— спрашчэнне патрабаванняў па атрыманні дазвольнай дакументацыі на будаўніцтва. Грунтоўна пашырыўся пералік выпадкаў, пры якіх яна і зусім не патрабуецца: мадэрнізацыя і рамонт, знос грамадзянамі нежылых капітальных пабудоў на выдзеленых зямельных участках, будаўніцтва ў мэтах ліквідацыі або папярэджання аварыйных і надзвычайных сітуацый, узвядзенне садовых домікаў, гаспадарчых пабудоў і іншыя;

— звядзенне да мінімуму патрабаванняў да будаўніцтва і рэканструкцыі аднакватэрных жылых дамоў і нежылых капітальных пабудоў пятага класа складанасці. Згодна з кодэксам, неабавязкова атрымліваць дазвол на будаўніцтва, распрацоўваць праект, узгадняць яго ў мясцовым органе ўлады і ў далейшым здаваць такі аб'ект у эксплуатацыю. У астатніх выпадках дастаткова атрымаць толькі пашпарт забудоўшчыка з мінімальным наборам патрабаванняў.

Таксама ён адзначыў, што пры бягучым рамонце ўжо не патрэбна праектная дакументацыя, дазвол, атэстаты адпаведнасці і кваліфікацыйныя пасведчанні аб тэхнічнай кампетэнтнасці сістэмы вытворчага кантролю, дэкларацыі бяспекі на будаўнічыя работы. Акрамя таго, пры прыёмцы аб'екта ў эксплуатацыю цяпер разглядаецца толькі адпаведнасць яго праектнай дакументацыі. Асобна Аляксандр Шваюноў падкрэсліў, што кодэкс вызначае дакладны рэгламент у дачыненні да даўгабудаў. Так, згодна з дакументам, прыпыніць будоўлю можна пры тэрміне будаўніцтва да года — не больш за два разы, ад года да двух — не больш за тры, звыш двух гадоў — чатыры разы. Узвядзенне жылога дома можна прыпыняць толькі тройчы, пры гэтым сумарна на тэрмін не больш за тры месяцы.

Рэзюмуючы, намеснік міністра выказаў упэўненасць, што рэалізацыя ўсіх намечаных планаў у сукупнасці будзе садзейнічаць далейшаму павышэнню эфектыўнасці работы будаўнічага комплексу.

Падчас абмеркавання дакладаў дэпутаты закранулі шэраг пытанняў, якія датычыліся функцыянавання будаўнічых арганізацый у рэгіёнах, заработнай платы работнікаў галіны, падрыхтоўкі кадраў і распрацоўкі праектнай дакументацыі. У прыватнасці, было агучана пажаданне перагледзець нормы выпрацоўкі і аплаты для муляраў. Аляксандр Шваюноў адказаў, што гэтае пытанне вельмі ўважліва вывучалася ў ведамстве і на сёння гэтыя нормы аптымальныя. Быў праведзены аналіз работы спецыялістаў, у тым ліку і з хронаметражом рабочага часу. Як высветлілася, асноўная праблема тут не ў нормах, а ў арганізацыі рабочага працэсу. Прасцей кажучы, калі ўсе тэхналагічныя аперацыі будуць выконвацца своечасова, то і заробкі будуць дастойныя. Звярнуў увагу намеснік міністра і на тое, што ўзровень заработнай платы не павінен адрывацца ад паказчыка прадукцыйнасці працы.

Іншае пытанне, якое ўзнялі дэпутаты, — розныя медыцынскія патрабаванні да навучэнцаў па рабочых спецыяльнасцях і ўласна да спецыялістаў. Сапраўды, часам узнікае сітуацыя, што па стане здароўя малады чалавек можа навучацца па спецыяльнасці, а вось ужо працаваць пасля заканчэння — не. Пытанне не сказаць каб відавочнае і вельмі вострае, але прэцэдэнты былі...

Таксама парламентарыі звярнуліся да намесніка міністра з прапановай павялічыць колькасць тыповых праектаў для аб'ектаў сацкультбыту. То-бок, напрыклад, ёсць праекты для школ, умоўна, на 1200 вучняў, на 800 і на 400. А на 500, 600 ці 300 — няма, і трэба ўносіць змены ў існуючыя тыпавыя праекты, што істотна адбіваецца на кошце будаўніцтва. Аляксандр Шваюноў зазначыў, што на самай справе гэтая праблема — не праблема. У краіне існуе так званы Фонд паўторнага скарыстання, дзе павінны назапашвацца ўсе праекты, па якіх вялося будаўніцтва і якімі можна карыстацца. Таму, перш чым уносіць змены ў тыпавы праект, варта звярнуцца ў адпаведныя службы і знайсці той, што падыходзіць.

Падводзячы вынікі пасяджэння, Юрый Наркевіч падкрэсліў важнасць і прадукцыйнасць такіх сустрэч як для дэпутацкага корпуса, так і для профільных ведамстваў, бо яны дазваляюць трымаць руку на пульсе падзей і быць у курсе сітуацыі ў галінах.

**Уладзімір ВЯРЭНІЧ.**

# «Нашы студэнты — мэтанакіраваныя і ўпэўненыя ў сваім выбары»

## Студэнты сённяшнія і ўчарашнія

***— Мікалай Мікалаевіч, вы з універсітэтам ужо больш за трыццаць гадоў. Сюды паступалі, адсюль выпускаліся. І, урэшце, узначалілі БДАТУ. Як лічыце, абітурыент сённяшні адрозніваецца ад абітурыента вашага пакалення?***

— Калі параўноўваць абітурыентаў розных часоў, то адзначу, што ў апошнія гады назіраецца пэўная іх трансфармацыя. Спецыфіка нашага ўніверсітэта ў тым, што пераважная большасць абітурыентаў — моладзь з сельскай мясцовасці або невялікіх райцэнтраў. Яны, лічы, усе як адзін працавітыя і адказныя. У іх высокая ступень мэтанакіраванасці, жаданне атрымліваць новыя веды і імкненне планамерна асвойваць усе прамудрасці інжынернай навукі. Літаральна з першых дзён студэнты ўцягваюцца ў карпатлівую працу па засваенні дысцыплін і ў выніку становяцца высокакваліфікаванымі спецыялістамі. Так было ў наш час, так і цяпер.

***— І ўсё ж...***

— Калі казаць канкрэтна пра адрозненні сучасных абітурыентаў ад моладзі мінулых гадоў, то адзначу некалькі ключавых аспектаў у падыходах да навучання і кар'ернай арыентацыі.

Па-першае, змяніўся ўзровень доступу да інфармацыі. Раней мы карысталіся ў асноўным традыцыйнымі крыніцамі інфармацыі: бібліятэкі, падручнікі і кансультацыі з выкладчыкамі. Тады вялікае значэнне мелі навыкі пошуку і правільнага выкарыстання інфармацыі, падрыхтоўкі да экзаменаў. Цяперашняя моладзь мае доступ да вялізнай колькасці адукацыйных рэсурсаў: відэалекцыі, анлайн-курсы, электронныя кнігі і іншыя лічбавыя матэрыялы. Яны таксама актыўна выкарыстоўваюць сацыяльныя сеткі і іншыя платформы для абмену інфармацыяй і атрымання ведаў.

Па-другое, абітурыенты сталі больш мэтанакіраванымі, упэўненымі ў сваім выбары і арыентаванымі на кар'еру. Яны выбіраюць найбольш запатрабаваныя прафесіі і шукаюць магчымасці для развіцця лічбавых навыкаў і кампетэнцый. Свет мяняецца, і сёння для паспяховай дзейнасці аграрыям патрэбны разнастайныя веды.

Па-трэцяе, у апошнія гады мы набіраем усё больш абітурыентаў з аграрных класаў, якія яшчэ са школы імкнуцца стаць студэнтамі нашага ўніверсітэта.

***— Сёння ў АПК актыўна развіваюцца тэхналогіі, з'яўляецца энерганасычаная тэхніка і праца становіцца больш лёгкай. Ці ўплывае гэта на выбар маладых людзей месца атрымання адукацыі?***

— Безумоўна, уплывае. Калісьці даярка даіла карову ўручную, а асноўнымі прыладамі працы ў цяпліцы былі рыдлёўка і матыка, сёння ж там аўтаматызаваныя практычна ўсе вытворчыя працэсы. Далёка наперад ступіла і тэхніка, якая працуе на палях. Невыпадкова кабіну сучаснага камбайна часам параўноўваюць з кабінай самалёта. Зразумела, што і кадры трэба рыхтаваць адпаведныя, памятаць, што ад нашых выпускнікоў залежыць будучыня сельскагаспадарчай галіны краіны.

## У віртуальнай рэальнасці

***— Што робіць адукацыю сучаснай?***

— Актыўна ўкараняюцца лічбавыя тэхналогіі: віртуальная рэальнасць, інтэрактыўныя камунікацыйныя тэхналогіі і іншыя. Так, напрыклад, сёлета ва ўніверсітэце створана навучальная лабараторыя інтэлектуальных тэхнічных сістэм у АПК, дзе студэнты адточваюць навыкі і ўменні выкарыстання сучасных лічбавых тэхналогій.

***— Уявіце, што перад вамі абітурыент альбо старшакласнік, які яшчэ выбірае будучую прафесію. Як вы пераканаеце яго спыніцца на БДАТУ, якія аргументы на карысць такога выбару?***



Фота БДАТУ.

— Наш універсітэт мае шэраг унікальных асаблівасцяў і з'яўляецца вядучай аграрнай тэхнічнай установай вышэйшай адукацыі. Мы максімальна нацэлены на практыка-арыентаваную падрыхтоўку спецыялістаў. Паралельна з асноўнай вучобай у студэнтаў ёсць магчымасць атрымаць рабочую прафесію (кіроўца механічных транспартных сродкаў катэгорыі «В»; трактарыст-машыніст катэгорыі «З», «D», «F»; слесар па рамонце сельскагаспадарчых машын і абсталявання; электраманцёр па рамонце і абслугоўванні электраабсталявання). І гэта не ўсё — пры жаданні маладыя людзі могуць атрымаць і іншыя спецыяльнасці: спартыўнага трэнера, спецыяліста па кадравым справаводстве, арганізатара экскурсійнага абслугоўвання насельніцтва, гаспадара аграсядзібы, кансультанта па абароне правоў спажыўцоў. Адзначу і арганізацыю адукацыйнага працэсу: у нас пяцідзённы навучальны тыдзень, субота — дзень кансультацый.

***— Якія базавыя спецыяльнасці атрымліваюць выпускнікі ўніверсітэта?***

— Мы ажыццяўляем падрыхтоўку па шасці інжынерных і дзвюх эканамічных спецыяльнасцях. Пасля заканчэння ўніверсітэта спецыяліст зможа працаваць не толькі ў АПК, але і ў любой галіне народнай гаспадаркі, бо спецыяльнасці, атрыманыя ў нас, не вузкія, яны закранаюць розныя бакі інжынернай дзейнасці. Дарэчы, універсітэт адзіны ў Беларусі вядзе падрыхтоўку спецыялістаў па ахове працы на вытворчасці. А пры заключэнні мэтавага дагавора гарантавана паступленне на сельскагаспадарчыя спецыяльнасці (кірункі адукацыі «Сельская гаспадарка» і «Ахова працы») без уступных экзаменаў.

Пяць з шасці інжынерных спецыяльнасцяў адносяцца да катэгорыі найбольш запатрабаваных эканомікай, што дазваляе паступаць без экзаменаў уладальнікам залатога ці сярэбранага медалёў, дыплома з адзнакай пасля заканчэння ліцэя або каледжа, пераможцам апошніх этапаў рэспубліканскіх алімпіяд. А абітурыентам, якія прайшлі тэрміновую ваенную службу, даецца права пазаконкурснага залічэння.

Усе навучальныя карпусы і інтэрнаты размешчаны ў крокавай даступнасці адзін ад аднаго ў самым цэнтры Мінска. Летам унутраны дворык нашага кампуса патанае ў зеляніне, на яго тэрыторыі ёсць сталовая, маладзёжны цэнтр, спартыўныя пляцоўкі...

## Практыка і яшчэ раз практыка

***— На адной з нядаўніх прэс-канферэнцый прагучала фраза аб тым, што БДАТУ — адна з самых практыка-арыентаваных ВНУ краіны...***

— Так, перш за ўсё адзначу, што практыка-арыентаванае навучанне — гэта не толькі арганізацыя навучальных, вытворчых і пераддыпломных практык. Гэта, акрамя таго, яшчэ і ўкараненне прафесійна-арыентаваных тэхналогій навучання, якія сфарміруюць у студэнтаў значныя для будучай прафесійнай дзейнасці якасці, веды, уменні і навыкі, прафесійны вопыт. Працэй кажучы — усё тое, што дазволіць ім якасна выконваць свае абавязкі падчас працы. Справа ў тым, што практыка-арыентаванае навучанне як працэс немагчыма рэалізаваць выключна ў рамках рознага роду вытворчых практык. Каб дасягнуць максімальнага эфекту, неабходна ўвесь час удасканальваць вучэбна-праграмную дакументацыю, што мы і робім. Калі казаць больш канкрэтна, то ў нас агульная працягласць практык у залежнасці ад спецыяльнасці складае ад 28 да 30 тыдняў і праходзіць у тры этапы.

***— Што за этапы?***

— Для праходжання вучэбнай практыкі на першым этапе ва ўніверсітэце створаны Рэспубліканскі вучэбна-вытворчы цэнтр практычнага навучання новым тэхналогіям і па асваенні комплексаў машын, дзейнічае шэсць спецыялізаваных майстэрняў, вучэбна-доследчы корпус і тры вучэбна-вытворчыя цэнтры ў Мінскай вобласці. Тут студэнты набываюць працоўныя прафесіі слесара, кіроўцы, трактарыста.

Другі этап праходзіць у базавых арганізацыях і на філіялах кафедраў. У нас створана 38 філіялаў кафедраў на вядучых прадпрыемствах аграпрамысловага комплексу, навукова-практычных цэнтрах НАН Беларусі. Акрамя таго, разам з Мінсельгасхарчам і камітэтамі па сельскай гаспадарцы аблвыканкамаў вызначана больш за 200 базавых сельскагаспадарчых арганізацый па ўсёй рэспубліцы, ад адной да трох у кожным раёне для праходжання вытворчых практык студэнтамі-мэтавікамі.

Трэці этап практычнай падрыхтоўкі, пераддыпломная практыка, уяўляе сабой працу дублёрамі асноўнага работніка. Звычайна яна праходзіць па месцы размеркавання выпускнікоў. Самі ж дыпломныя работы выконваюцца з улікам рэальных праблем менавіта гэтага прадпрыемства, што, з аднаго боку, максімальна накіроўвае «дыплом» у практычнае рэчышча, а з другога — скарачае адаптацыйны перыяд маладых спецыялістаў, яны ўжо ведаюць агульны стан гаспадаркі, яе моцныя і слабыя бакі.

Дадам таксама, што апошнім часам мы пайшлі шляхам стварэння брэндавых аўдыторый. Айчынныя вытворцы тэхнікі з задавальненнем адгукаюцца і дапамагаюць нам у іх абсталяванні. Напрыклад, сёлета такую аўдыторыю на базе БДАТУ адкрыў Мінскі маторны завод. Гэта паслужыла вялікай падмогай не толькі для выпуску кампетэнтных спецыялістаў, якія добра ведаюць прадукцыю ММЗ і якасна выконваюць сэрвіснае суправаджэнне яго вырабаў, але і для абмену вопытам з прадстаўнікамі іншых арганізацый і прадпрыемстваў, якія праходзяць навучанне на базе ўніверсітэта.

## Ад камбайна да беспілотніка

***— Вытворчую базу ўніверсітэта па аснашчанасці параўноўваюць з экспазіцыяй тэхнікі на выставе «Белагра». Яна такая ж сучасная і тэхналагічная?***

— Ва ўніверсітэце створана ўнікальная матэрыяльная база, і ў нас дзейнічае правіла — лепш адзін раз убачыць, чым сто разоў пачуць. З якіх дэталяў складаецца трактар, як працуе рухавік, у чым асаблівасць даільнага абсталявання і для чаго патрэбны GPS-тэхналогіі ў энерганасычанай мабільнай тэхніцы — пра ўсё гэта студэнты могуць даведацца, не выходзячы за межы студэнцкага гарадка.

У выставачным павільёне БДАТУ пастаянна абнаўляецца інфармацыя аб сучасных тэхналогіях механізацыі, набываюцца найноўшыя ўзоры сельскагаспадарчай тэхнікі і абсталявання. Сёлета адкрыліся інавацыйныя навукова-адукацыйныя лабараторыі дыстанцыйнага кантролю і кіравання сельскагаспадарчай тэхнікай і абсталяваннем, робатамі і дронамі, беспілотнымі робатамі. Ёсць лабараторыі маніторынгу выкарыстання інфармацыйных і камунікацыйных тэхналогій, датчыкаў і IoT-прылад. Наладжана аўтаматызацыя кіравання бізнес-працэсамі ўніверсітэта для лічбавізацыі стратэгічнага планавання, фінансава-эканамічнай справаздачнасці.

***— На чым заснавана ўзаемадзеянне ўніверсітэта з работадаўцамі, ці ёсць нейкія асаблівыя, адметныя рысы?***

— У адпаведнасці з даручэннем міністра сельскай гаспадаркі і харчавання ўсе студэнты 1-2 курсаў замацаваны за сельскагаспадарчымі арганізацыямі. Заключаны 791 індывідуальны дагавор, у тым ліку 419 дагавораў для студэнтаў першага курса.

У нас наладжана ўзаемадзеянне з 223 базавымі сельскагаспадарчымі арганізацыямі, якія вызначаны загадамі камітэтаў па сельскай гаспадарцы аблвыканкамаў — гэта суб'екты АПК, якія валодаюць сучаснай матэрыяльна-тэхнічнай, вытворчай і арганізацыйна-тэхналагічнай базай.

Для ўзмацнення практыка-арыентаванай кампаненты адукацыйнага працэсу студэнтаў зацверджаны графік выязных заняткаў на вытворчасці. Штогод фарміруем не менш за 20 студэнцкіх атрадаў для працы на прадпрыемствах. У 2023 годзе, напрыклад, у іх удзельнічалі больш за 40 % студэнтаў дзённай формы навучання.

Цеснаму супрацоўніцтву з сельскагаспадарчымі арганізацыямі садзейнічае і аказанне ім кансультатыўнай дапамогі па вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі, эксплуатацыі і тэхнічным сэрвісе тэхнікі, эканоміцы і арганізацыі вытворчасці на прадпрыемстве.

## Наступленне на «лічбу»

***— Ці з'явяцца ў найбліжэйшы час у АПК новыя кірункі, а значыць, і новыя прафесіі? Універсітэт гатовы аператыўна падрыхтаваць запатрабаваных спецыялістаў?***

— Сёння ўсё больш абаротаў набірае лічбавая сельская гаспадарка, можа з'явіцца неабходнасць у спецыялістах, якія займаюцца, напрыклад, зборам, аналізам і інтэрпрэтацыяй даных, якія працуюць з дронамі, сэнсарамі, спадарожнікамі і іншымі рэсурсамі. З часам узнікне патрэба ў спецыялістах па кіраванні разумнымі фермамі, цяпліцамі. Наспявае адкрыццё новай спецыяльнасці «Тэхнічная эксплуатацыя і беспілотныя лятальныя апараты ў сельскагаспадарчай вытворчасці».

І мы гэта ўсё прадугледжваем. Напрыклад, ужо ў мінулым навучальным годзе рэалізавана 17 актуалізаваных і новых навучальных праграм павышэння кваліфікацыі з разглядам пытанняў лічбавізацыі. Адна з іх накіравана на фарміраванне ў рэспубліцы кампетэнтнага персаналу ў галіне ідэнтыфікацыі, рэгістрацыі і нагляду за ўсімі відамі жывёл (статкаў), птушкі, пушна-футравых жывёл, жывёл-гідрабіёнтаў, пчол (пчаласем'яў), а таксама ў частцы ідэнтыфікацыі і нагляду за прадуктамі жывёльнага паходжання, ветэрынарнай дзейнасці. Гэтыя спецыялісты змогуць працаваць у дзяржаўнай інфармацыйнай сістэме AITS. Па ўзгадненні з Мінсельгасхарчам распрацаваны і рэалізаваны тры праграмы павышэння кваліфікацыі, якія забяспечваюць максімальна хуткае ўкараненне інавацый у вытворчы працэс.

З пастаянным развіццём тэхналогій і павелічэннем попыту на бяспечныя, устойлівыя і прадукцыйныя рашэнні ў сельскай гаспадарцы новыя напрамкі і прафесіі будуць з'яўляцца і надалей. А мы, у сваю чаргу, гатовы займацца падрыхтоўкай адпаведных спецыялістаў.

***— Ці сочыце вы, як складваецца далейшае прафесійнае жыццё вашых выпускнікоў? Ці дапамагаеце ім у выпадку неабходнасці?***

— Мы суправаджаем усіх нашых выпускнікоў на працягу мінімум пяці гадоў іх працоўнай дзейнасці. Работнікі дэканатаў, былыя куратары навучальных груп увесь час падтрымліваюць сувязь з маладымі спецыялістамі, цікавяцца ўмовамі працы і побыту. Вядома, дапамагаем ім і, вядома, ганарымся іх дасягненнямі.

За 70 гадоў наша кузня кадраў падрыхтавала больш за 65 тысяч спецыялістаў для АПК. Сярод іх шмат паспяховых кіраўнікоў сельскагаспадарчых арганізацый. Прычым не толькі ў Беларусі. З большасцю выпускнікоў у нас склаліся цёплыя, сяброўскія адносіны. І менавіта такія выпускнікі БІМСГ-БДАТУ, якія не забываюць дарогу ў родную альма-матар, даюць нядаўнім выпускнікам і цяперашнім студэнтам прыклад таго, як з падзякай ставіцца да мінулага, быць адкрытымі да новага і не баяцца перамен.

**Алена ВІНАГРАДАВА.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

**16.00** Футбол. Беларусбанк — чэмпіянат Беларусі. «Смаргонь» — «Віцебск».
**18.00** Футбол. Беларусбанк — чэмпіянат Беларусі. «Дынама-Мінск» — «Іслач» (Мінскі раён).
**1.00** Маст. фільм «Міжсезонне» (18+).

## Звязда

**2.50** Маст. фільм «Чырвоны змей» (16+).
**4.25** Дак. серыял «Хронас».
**6.00** «Сяргей Вайцяхоўскі. Генерал без Радзімы». Дак. фільм (12+).
**7.00** «Навіны».
**7.20** «Мерседэс адыходзіць ад пагоні». Маст. фільм (12+).
**8.40** «Варыянт «Амега». Маст. фільм (12+).
**9.50, 10.40, 11.30, 12.20** «Разведчыцы» (16+).
**13.10, 13.55, 14.40, 15.25, 16.10** «Курсанты» (16+).
**16.55** «Мы з будучыні». Маст. фільм (12+).
**18.55, 19.45, 20.35, 21.25** «Лёс дыверсанта» (12+).
**22.15** «Барыс Савінкоў. Чужы сярод сваіх». Дак. фільм (12+).
**23.10** «Айзек з Пятровічаў. Успомніць будучыню». Дак. фільм (12+).
**23.40** «Карэя. Маўчаць — не значыць забыцца». Дак. фільм (12+).
**0.10** «Беларускі вердыкт. Сябры і ворагі Фрыца Шменкеля». Дак. фільм (12+).
**0.40** «Джульбарс і Дзіна. Сабакі службы «Д». Дак. фільм (12+).
**1.10** «Заложнік «Сатурна». Без права быць сабой». Дак. фільм (12+).
**1.40** «Маленькія салдаты вялікай вайны». Дак. фільм (12+).
**2.10** «Азарычы. Ахвяры «Эскулапа». Дак. фільм (12+).
**2.40** «Зона загароды. У небяспечнай рысы». Дак. фільм (12+).
**3.10** «1939 год. Уз'яднанне». Дак. фільм (12+).
**3.40** «Нябачная варта дзяржавы». Дак. фільм (12+).

*У праграме магчымыя змяненні.*
*Перадрукоўка праграмы забароненая.*
*[СЦ] – фільм транслiруецца са скрытымi субцiтрамi.*

## Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.25** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00** Навіны.
**8.20, 22.50** Зона Х (16+).
**9.20** «Здарова здаровым быць!» (6+) [СЦ]
**10.10, 23.10 Серыял «След» (16+).**
**12.25, 1.10** «Скажынемаўчы».
**13.20, 15.30 Меладрама «Незламаная» (12+).**
**15.15, 18.45** Навіны рэгіёна.
**17.45** Беларуская часінка.
**19.10 Меладрама «Таксічнае каханне» (12+).**
**21.00** Панарама.
**21.50** Эканамічнае асяроддзе (12+).

## АНТ

**6.00, 7.10, 8.10, 9.10** «Наша раніца».
**7.00, 8.00, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30** Нашы навіны.
**10.00** «Жыць здарова!» (16+)
**11.15** «Модны прыгавор» (6+).
**12.20, 13.15, 22.45 Фільм «Каварныя гульні» (16+).**
**15.00** «Давай пажэнімся!» (16+)
**16.20** «Мужчынскае/Жаночае» (16+).
**17.20, 18.20** Інфармацыйны канал (16+).
**19.00** «Аб'ектыўНА» (16+).
**20.00, 0.40** Час.
**21.20** «Усё зразумела з Марынай Караман» (16+).
**21.30 Фільм «Ракіроўка» (12+).**

## СТБ

**6.00, 6.40, 7.45, 8.40** «Раніца СТБ».
**6.30, 7.30, 8.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** Навіны «24 гадзіны».
**9.00** Дак. праект «Назад у СССР» (16+).
**10.40** Дак. праект «Тайны космасу» (12+).
**13.50, 0.50 «Дэльфін». Серыял (16+).**
**16.50** «Міншчына».
**17.00 «Хуткая дапамога-4». Серыял (16+).**
**20.15** «Тайныя спружыны палітыкі».
**20.30, 23.05** «СТБ-спорт».

**20.35** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.45 «Акушэр». Серыял (16+).**
**23.20** «Азаронак. Напрамую».

## МІР

**5.00, 4.40 Тэлесерыял «Школа выжывання ад адзінокай жанчыны з трыма дзецьмі ва ўмовах крызісу» (12+).**
**5.45, 6.15, 10.10 Тэлесерыял «Дзяржаўная граніца» (12+).**
**6.00, 10.00, 13.00, 16.00, 18.30** Навіны.
**13.15** «Міравое пагадненне» (16+).
**14.10** «Справы судовыя. Бітва за будучыню» (16+).
**15.05** «Справы судовыя. Новыя гісторыі» (16+).
**16.15** «Справы судовыя. Яблык разладу» (16+).
**17.15** «Справы судовыя. Грошы вярніце!» (16+)
**18.50** «Гульня ў кіно» (16+).
**21.45** «Мільён за 5 хвілін» (16+).
**22.30 Маст. фільм «Пра беднага гусара замовіце слова» (16+).**
**1.50** Першы Еўразійскі канал (12+).
**3.00 Маст. фільм «Яды, або Сусветная гісторыя атручэнняў» (18+).**

## Першы Інфармацыйны

**5.55, 0.00** Гімн.
**6.00, 7.00, 8.00, 9.00, 10.00, 10.30, 11.00, 11.30, 12.00, 12.30, 13.00, 13.40, 14.00, 14.30, 15.00, 16.00, 18.00, 19.00, 20.00, 21.00, 21.40, 22.40, 0.00, 1.00, 2.00, 3.00, 4.00** Навіны.
**6.20, 7.20, 8.20, 9.20, 10.20, 13.20, 1.20, 2.10, 3.10, 4.35** Інфаканал.
**6.50** Навіны эканомікі (12+).
**7.50, 8.46, 10.35, 11.36, 13.44, 18.12, 19.45, 21.20** Актуальнае інтэрв'ю (12+).
**7.55, 8.45, 9.40** Метадата.
**8.40, 9.41, 10.45, 12.40, 22.15** Спецыяльны рэпартаж (12+).
**9.37, 12.35, 14.45** Меркаванне.
**11.10** Тэлефільм (12+).
**11.35, 12.33, 17.39, 18.10** Прагноз надвор'я.
**11.50** Прэс-агляд (12+).
**11.53, 12.54** Тэма дня.
**12.20, 14.20, 15.28** Дак. фільм (12+).
**14.50, 16.20, 18.30** Навіны спорту.
**15.15** Навіны рэгіёна.

**19.30, 20.30, 22.00** Сфера інтарэсаў (12+).
**23.00** Аналітычная праграма (12+).

## РТР—Беларусь

**6.00, 9.00, 11.30, 14.30, 17.30, 21.00, 23.00** Беларусь. Навіны.
**6.05, 9.05** «Новая раніца».
**10.05 Фільм «Бендэр. Золата імперыі» (16+).**
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.40** «Рэцэпт сапраўднага беларуса».
**12.50** «Кропкі над «і» (16+).
**14.40, 17.40 Тэлесерыял «Тайны следства» (12+).**
**15.30** «60 хвілін».
**18.45** «Малахаў» (16+).
**20.20** «Так! Але...»
**21.30, 23.15 Тэлесерыял «Дама з сабачкам. Працяг» (16+).**
**23.55** «Вечар з Уладзімірам Салаўёвым» (12+).

## НТБ—Беларусь

**6.10** «Астрапрагноз».
**6.15, 7.10, 8.20, 13.20, 22.50, 23.45** Сёння. Галоўнае.
**6.20** «Здорава здаровым быць!» (6+)
**7.25** Гісторыі выратавання (12+).
**8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**8.35, 21.25** «НЗ.by».
**8.55** Сфера інтарэсаў.
**9.10** «Зламаць стэрэатыпы» (12+).
**9.30, 10.35 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў» (16+).**
**13.25** «Надзвычайнае здарэнне».
**13.55** «За гранню» (16+).
**14.55** «ДНК» (16+).
**16.40, 20.00** Галоўнае. Сёння. Беларусь.
**16.50 Серыял «Пёс» (16+).**
**20.15, 21.45 Серыял «Варагі» (16+).**
**22.55, 0.00 Дэтэктыў «Неўскі. Расплата за справядлівасць» (16+).**

## Беларусь 3

**7.00** «Дабраранак».
**7.35, 12.30** «Беларуская кухня».
**8.05, 13.00, 16.35, 20.30, 22.45** «Навіны культуры».
**8.15, 21.05 «Афіцэрскія жонкі». Маст. фільм (16+).**
**9.55** «Легенды эстрады».
**10.35, 17.00 «Доўгая дарога ў дзюнах». Маст. фільм (12+).**
**11.55** «Сэнс жыцця».
**12.20** «Асобы».

**13.10, 18.20** «Апошні дзень» (12+).
**13.50, 19.00 «Без права на памылку». Маст. фільм (12+).**
**15.20** «Славянскі базар у Віцебску».
**16.45** «Архітэктура Беларусі».
**20.40** «Калыханка» (0+).
**23.00** «Кадры жыцця».

## Беларусь 5

**6.55** Хакей. КХЛ. «Барыс» (Астана) — «Дынама» (Масква).
**8.55** Футбол. Чэмпіянат Беларусі. «Дынама-Мінск» — ФК «Мінск».
**10.50** Футбол. Чэмпіянат Расіі. ФК «Ніжні Ноўгарад» — «Лакаматыў» (Масква).
**12.50** Футбол. Чэмпіянат Расіі. Агляд.
**13.40** Хакей. КХЛ. «Сібір» (Навасібірск) — ХК «Сочы».
**15.35** Як гэта было.
**16.05** Валейбол. Суперкубак Беларусі — 2024. Мужчыны. «Шахцёр» (Салігорск) — «Энергія» (Гомель).
**17.50** Футбол без меж. Еўрагалы.
**18.50** Хакей. МХЛ. «Дынама-Шыннік» — «СКА-1946». У перапынках — «Спорт-цэнтр».
**21.10** Слэм-данк.
**21.40** Баскетбол. Адзіная ліга. ЦСКА (Масква) — «Уралмаш» (Екацярынбург). У перапынку — «Спорт-цэнтр».
**23.15** Між іншым.
**23.35** Змешаныя адзінаборствы.

## Беларусь 2

**6.00** «Уключайся!» (12+)
**10.00, 16.55** Тэлебарометр.
**10.05, 17.55** «Знакі лёсу» (16+).
**10.35 Дэтэктыў «Філін-2» (16+).**
**12.35** Суд вырашыць (16+).
**13.40, 22.15 Серыял «Спаская-3» (16+).**
**15.55** Нічога сабе ньюз (12+).
**16.00** «ПІН_КОД» (12+).
**17.00** Як дома (16+).
**17.35** «Карысная праграма» (16+).
**18.25 Дэтэктыў «Жанчына з катом і дэтэктывам» (12+).**
**20.15 Серыял «Выпраўленне і пакаранне» (16+).**
**21.10** Спортлато 5 з 36, КЕНА.
**21.15 Камедыя «Радкам» (16+).**
**0.25 Дэтэктыў «Сышчыца» (16+).**





## 8 канал

**7.00, 21.00** «Надвор'е».
**7.05** Мультпарад.
**7.25** «Дзеці аб ежы».
**7.45, 15.20** Камедыя «Медыум» (12+).
**9.30, 12.10, 14.05** Серыял «Код доступу» (16+).
**11.15** «Дак. экран».
**14.00, 17.10, 19.00** «Надвор'е» + «Эрана».
**15.15** Прыколы 13-й школы» (6+).
**17.15** Драма «На подступах да Масквы» (12+).
**19.05** «Вячэрні серыял».
**20.50** «Вечарніца».
**21.05** «Урокі Лазуркіна».
**21.10** Вячэрні кінамарафон.
**0.30** «Начны серыял».

## Культура

**6.30** «Пешшу...»
**7.05, 17.15** «Першыя ў свеце». Дак. серыял.
**7.20, 18.45** Прыступкі цывілізацыі.
**8.05** «Жыццё і лёс».
**8.25, 21.25** «Алёшкіна каханне». Маст. фільм.
**10.00, 12.30, 16.30, 19.30, 23.50** Навіны культуры.
**10.20** «Акадэмік Іван Паўлаў». Маст. фільм.
**11.55** «Адлюстраваны час». Дак. серыял.
**12.45** «Забытае рамяство». Дак. серыял.
**13.00** «Алег Басілашвілі. З неапублікаванага». Дак. фільм.
**13.45** «Восеньскі марафон». Маст. фільм.
**15.20** Раман у камені.
**15.45** «Энігма». Уладзіслаў Чарнушэнка.
**16.45** Лісты з правінцыі.
**17.30** «Царская ложа».
**18.10** Гістарычныя курорты Расіі.
**19.45** Лінія жыцця.
**20.45** «Настаўнік года Расіі — 2024».
**22.50** «2 Вернік 2».
**0.05** «Цікавае жыццё». Маст. фільм.

**1.35** Шукальнікі.
**2.20** Мультфільмы для дарослых.

## Настальгія

**6.00** «Спяем, сябры!» (16+)
**6.55** Маст. фільм «Такія розныя лёсы» (18+).
**8.35, 9.40, 11.30, 12.45, 14.50, 15.40, 17.00, 19.05, 20.45, 21.40, 23.30, 3.40, 5.30** Музычная настальгія (12+).
**9.00, 15.00, 21.00, 3.00** «Мінулы час» (12+).
**10.00, 16.00, 22.00, 4.00** «Народжаныя ў СССР» (16+).
**11.00, 17.00, 23.00, 5.00** «Блеф-клуб» (16+).
**12.00** «Яловая субмарына» (16+).
**12.55** Маст. фільм «Злыя і прыгожыя» (12+).
**18.00** «Да і пасля...» (16+)
**19.25** Маст. фільм «Каханне лепшае, чым калі-небудзь» (16+).
**0.00** «Быў час» (16+).
**0.50** Маст. фільм «Вязень крэпасці Зенда» (16+).
**2.30** Дак. фільм «Да і пасля трох секунд» (12+).

## EuroSport 1

**3.00, 7.00, 10.30, 13.00, 13.45, 2.00** Веласпорт. Цюрых. Мужчыны (16+).
**4.00, 8.00, 11.30, 20.00, 21.00** Снукер (6+).
**6.00, 9.30** Веласпорт. Цюрых. Жанчыны (16+).
**18.15, 19.30** Маўнцінбайк. Мужчыны ELITE (16+).
**0.00** Каратэ (6+).
**1.00** Трыятлон (6+).
**1.30** Скалалажанне. Жанчыны BOULDER (0+).

## Кінакамедыя

**1.25** «Паляўнічы на галовы» (16+).
**3.25** «Спытайце Сіндзі» (16+).

**5.10** «Хэпі-энд» (12+).
**7.05** «Астэрыкс і Абелікс: Паднябесная» (16+).
**9.10** «Прыгажунчык-2» (18+).
**11.30** «За Палыча!» (12+)
**13.20** «Таксі-3» (16+).
**15.00** «Як я стаў рускім» (16+).
**16.55** «Зялёная кніга» (16+).
**19.30** «Аднакласнікі-2» (18+).
**21.25** «Малавіта» (16+).
**23.30** «Агент пад прыкрыццём» (12+).

## ТБ3

**6.00** Калекцыя «Беларусьфільма» (12+).
**10.05** «Мёд асы» (12+).
**11.30** «Паглядзім» (12+).
**12.00, 18.10** «Каралёк — птушачка пеўчая» (16+).
**13.45, 20.00, 2.00** «Сляпая» (16+).
**15.10, 21.00, 3.15** «Варажбітка» (16+).
**16.45** «Старац» (16+).
**22.05** «Салодкі лістапад» (16+).
**0.10** «Хваля» (16+).
**4.30** «Суд ідзе». Дак. серыял (16+).

## ТБ1000

**6.15** Чалавек-матылёк (16+).
**8.35, 9.30, 23.40, 0.40** Чыста англійскія забойствы (18+).
**10.30** Восень у Нью-Ёрку (16+).



**12.40** Грыфін і Фенікс: на краі шчасця (18+).
**14.40, 1.30** Лімб (16+).
**16.40** Прыстанак праклятых (16+).
**19.00, 4.35** Востраў праклятых (16+).

**21.45** Тайнае акно (16+).
**3.00** Пінжак (16+).

## ТБ1000 Рускае кіно

**5.30** Маша і Мядзведзь (кліпы) (6+).
**5.50** Атэль у авечак (6+).
**6.40** Смяшарыкі (6+).
**7.30** Свая вайна. Шторм у пустыні (16+).
**9.25** 22 хвіліны (16+).
**11.00** Крым (16+).
**13.05** Авантурысты (16+).
**15.00** Каханне без памеру (16+).
**16.50** Хачу замуж (16+).
**19.00** Тэрмінова выйду замуж (16+).
**21.10** Выкрутасы (12+).
**23.10** На кручку! (16+)
**0.55** Бумер (16+).
**2.40** Бумер-2 (16+).
**4.30** Дзікія лебедзі (6+).

## ЯСНАе

**5.20** Серыял «Далёка ад вайны» (16+).
**7.10** Серыял «Мужчынская работа-2» (12+).
**8.45** «Ясна аб міні-футболе».
**9.15** Серыял «Рускі пераклад» (16+).
**11.00** Серыял «Сляпы. Зброя адплаты» (16+).
**12.35** Серыял «Брат за брата-2» (16+).
**14.15** Серыял «Шэф. Вяртанне» (16+).
**16.00** Серыял «Марскія д'яблы-4» (16+).
**17.40** Серыял «Гарачая кропка-2» (16+).
**19.25** Серыял «Група Zeta» (16+).
**21.00** «Час высокіх тэхналогій».
**21.25** Серыял «Загадана знішчыць. Аперацыя Кітайская шкатулка» (12+).
**22.55** Маст. фільм «Робін Гуд. Пачатак» (12+).
**0.50** Маст. фільм «Экіпаж» (12+).
**3.05** Маст. фільм «Непаслушнік» (16+).

## ЗВЯЗДА

**6.00, 2.10** «1939 год. Уз'яднанне». Дак. фільм (12+).
**6.30** «Шталаг 354». Дак. фільм (12+).
**7.00, 19.30, 23.00** «Навіны».
**7.20, 19.50** «Праверана на сабе. Жаночы погляд» (12+).
**7.35** «У лясах пад Ковелем». Маст. фільм (12+).
**8.45, 21.45** «Варыянт «Амега». Маст. фільм (12+).
**10.05, 10.55, 17.50, 18.40, 20.05, 20.55** «Разведчыцы» (16+).
**11.45, 12.35** «Канвой PQ-17» (12+).
**13.30** «Мерседэс уцякае ад пагоні». Маст. фільм (12+).
**14.50, 15.35** «Чырвоная капэла» (12+).
**16.20** «Чаканне палкоўніка Шалыгіна». Маст. фільм (12+).
**19.45, 23.15** «Навіны ў форме».
**23.20** «Сяргей Вайцяхоўскі. Генерал без Радзімы». Дак. фільм (12+).
**0.15** «У гарах Афганістана». Дак. фільм (12+).
**0.25** «За Зіну Тусналобаву!» Дак. фільм (12+).
**0.40** «Маленькія салдаты вялікай вайны». Дак. фільм (12+).
**1.10** «Ілжэпартызаны. Па легендзе Абвера». Дак. фільм (12+).
**1.40** «Доктар Слон. Стаўка на чырвонае». Дак. фільм (12+).
**2.40** «Трасцянец. Алея смерці». Дак. фільм (12+).
**3.10** «Палескі кацёл. Армія асуджаных». Дак. фільм (12+).
**3.40** «Бабруйскі вузел. Ліквідацыя». Дак. фільм (12+).

---

*У праграме магчымыя змяненні.*
*Перадрукоўка праграмы забароненая.*
*[СЦ] – фільм транслiруецца са скрытымі субцітрамі.*

## Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.25** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00** Навіны.
**8.20** Зона Х (16+).
**8.50** Слова Мітрапаліта Веніяміна на свята Узвышэння Святога Крыжа.
**9.20** «Здарова здаровым быць!» (6+) [СЦ]
**10.15, 23.10 Серыял «След» (16+).**
**12.25, 0.10** «Скажынемаўчы».
**13.25, 15.30 Меладрама «Няма жыцця без цябе» (16+).**
**15.15, 18.45** Навіны рэгіёна.
**17.45** «100 пытанняў даросламу» (12+).
**19.10 Меладрама «Цана здрады» (12+).**
**21.00** Панарама.
**21.50** Клуб рэдактараў (16+).

## АНТ

**6.00, 7.10, 8.10, 9.10** «Наша раніца».
**7.00, 8.00, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30** Нашы навіны.
**10.00** «Жыць здарова!» (16+)
**11.15** «Модны прыгавор» (6+).
**12.20, 13.15, 23.05 Фільм «Каханне з прабіркі» (16+).**
**15.00** «Давай пажэнімся!» (16+)
**16.20** «Мужчынскае/Жаночае» (16+).
**17.30** «Трывожная кнопка» (16+).
**18.20** Інфармацыйны канал (16+).
**18.50** «Поле цудаў» (16+).
**20.10** Вячэрнія навіны.
**21.20** «Лаўроў. За гранню» (16+).
**21.30** «Што? Дзе? Калі? у Беларусі» (16+).
**1.15** Час.

## СТБ

**6.00, 6.40, 7.45, 8.40** «Раніца СТБ».
**6.30, 7.30, 8.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** Навіны «24 гадзіны».
**9.00** Дак. праект "Хронікі маскоўскага побыту" (16+).
**10.40** Дак. праект «Неверагодная навука» (12+).
**13.50, 0.50 «Дэльфін-2». Серыял (16+).**
**16.50** «Міншчына».
**17.00** «Крокі Незалежнасці».
**17.20** «Рашэнне ёсць! Дэпутацкі адказ».
**17.50** Дак. праект (16+).
**18.45** «У пошуках ісціны. Крывавая гісторыя «.
**20.15** «Беларуская супержанчына».
**20.25, 23.05** «СТБ-спорт».
**20.35** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.45 «Акушэр». Серыял (16+).**
**23.20** «Азаронак. Напрамую».

## МІР

**5.00 Тэлесерыял «Школа выжывання ад адзінокай жанчыны з трыма дзецьмі ва ўмовах крызісу» (12+).**
**5.25, 6.15 Маст. фільм «Салон прыгажосці» (16+).**
**6.00, 10.00, 13.00, 16.00, 18.30** Навіны.
**7.05 Маст. фільм «Гараж» (16+).**
**9.15, 10.10 Маст. фільм «Пра беднага гусара замовіце слова» (16+).**
**13.15** «Міравое пагадненне» (16+).
**14.10** «Справы судовыя. Бітва за будучыню» (16+).
**15.05** «Справы судовыя. Новыя гісторыі» (16+).
**16.15** «Справы судовыя. Яблык разладу» (16+).
**17.15** «Справы судовыя. Грошы вярніце!» (16+)
**18.50** «Мільён за 5 хвілін» (16+).
**19.30 Маст. фільм «Няўлоўныя мсціўцы».**
**21.10 Маст. фільм «Новыя прыгоды няўлоўных».**
**23.00 Маст. фільм «Карона расійскай імперыі, або Зноў няўлоўныя».**
**1.35 Маст. фільм «Учора, сёння, заўтра» (16+).**
**3.35 Маст. фільм «Яды, або Сусветная гісторыя атручэнняў» (18+).**

## Першы Інфармацыйны

**5.55, 0.00** Гімн.
**6.00, 7.00, 8.00, 9.00, 10.00, 10.30, 11.00, 11.30, 12.00, 12.30, 13.00, 13.40, 14.00, 14.30, 15.00, 16.00, 18.00, 19.00, 20.00, 21.00, 21.40, 22.40, 0.00, 1.00, 2.00, 3.00, 4.00** Навіны.
**6.20, 7.20, 8.20, 9.20, 10.20, 13.20, 1.20, 2.10, 3.10, 4.35** Інфаканал.
**6.50** Навіны эканомікі (12+).
**7.50, 8.46, 10.35, 11.36, 13.44, 18.12, 19.45, 21.20** Актуальнае інтэрв'ю (12+).
**7.55, 8.45, 9.40** Метадата.
**8.40, 9.41, 10.45, 12.40, 22.15** Спецыяльны рэпартаж (12+).
**9.37, 12.35, 14.45** Меркаванне.
**11.10** Тэлефільм (12+).
**11.35, 12.33, 17.39, 18.10** Прагноз надвор'я.
**11.50** Прэс-агляд (12+).
**11.53, 12.54** Тэма дня.
**12.20, 14.20, 15.28** Дак. фільм (12+).
**14.50, 16.20, 18.30** Навіны спорту.
**15.15** Навіны рэгіёна.
**19.30, 20.30, 22.00** Сфера інтарэсаў (12+).
**23.00** Аналітычная праграма (12+).

## РТР—Беларусь

**6.00, 9.00, 11.30, 14.30, 17.30, 21.00, 23.00** Беларусь. Навіны.
**6.05, 9.05** «Новая раніца».
**10.05 Фільм «Бендэр. Апошняя афёра» (16+).**
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.40** «Пра самае галоўнае» (12+).
**12.50** «Кропкі над «і» (16+).
**14.40, 17.40 Тэлесерыял «Тайны следства» (12+).**
**15.30** «60 хвілін».
**18.45** «Прамы эфір» (16+).
**21.30, 23.15 Меладрама «Крывое люстэрка» (12+).**
**23.45 Фільм «Упершыню замужам» (12+).**
**1.35** «Гісторыі вялікай краіны» (12+).

## НТБ—Беларусь

**6.10** «Астрапрагноз».
**6.15, 7.10, 8.20, 13.20, 22.55, 23.45** Сёння. Галоўнае.
**6.20** «Здорава здаровым быць!» (6+)
**7.25** Гісторыі выратавання (12+).
**8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**8.35** «НЗ.by».
**8.55** Сфера інтарэсаў.
**9.10** «Зламаць стэрэатыпы» (12+).
**9.30, 10.35 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў» (16+).**
**13.25** «Надзвычайнае здарэнне».
**13.55** «ДНК» (16+).
**15.00** «Чакай мяне» (12+).
**16.40, 20.00** Галоўнае. Сёння. Беларусь.
**16.50 Серыял «Пёс» (16+).**
**20.15, 21.55 Серыял «Варагі» (16+).**
**21.25** «НЗ.by: час вынікаў».
**23.00, 0.00 Дэтэктыў «Неўскі. Расплата за справядлівасць» (16+).**

## Беларусь 3

**7.00** «Дабраранак».
**7.35, 12.20** «Беларуская кухня».
**8.05, 13.00, 16.50, 20.30, 22.50** «Навіны культуры».
**8.15, 21.05 «Афіцэрскія жонкі». Маст. фільм (16+).**
**9.55** «Легенды эстрады».
**10.35, 17.00 «Доўгая дарога ў дзюнах». Маст. фільм (12+).**
**11.40** «Сэнс жыцця».
**12.10** «Асобы».
**12.50** «Размовы пра духоўнае».
**13.10** «Галоўны дзень» (12+).
**13.50, 18.45 «Застава ў гарах». Маст. фільм (12+).**
**15.30** «Славянскі базар у Віцебску».
**16.20** «Сіла веры».
**18.05** «Галоўны дзень» (12+).
**20.40** «Калыханка» (0+).
**23.00** «Кадры жыцця».

## Беларусь 5

**6.55** Хакей. КХЛ. «Барыс» (Астана) — ХК «Сочы».
**8.55** Хакей для ўсіх.
**9.25** Хакей. КХЛ. «Куньлунь РС» (Пекін) — «Дынама-Мінск».
**11.20** На спорце.
**11.40, 15.30, 22.55** Змешаныя адзінаборствы.
**13.30** Хакей. КХЛ. «Сібір» (Новасібірск) — «Аўтамабіліст» (Екацярынбург).
**16.30** Футбол. Чэмпіянат Расіі. ФК «Арэнбург» — ФК «Ніжні Ноўгарад». У перапынку Спорт-цэнтр.
**18.25** Футбол. Чэмпіянат Беларусі. БАТЭ (Барысаў) — «Шахцёр» (Салігорск). У перапынку Спорт-цэнтр.
**20.25** Футбол. Чэмпіянат Беларусі. ФК» Гомель» — «Дынама» (Брэст). У перапынку Спорт-цэнтр.
**22.25** Авертайм.

## Беларусь 2

**6.00** «Уключайся!» (12+).
**10.00, 16.55** Тэлебарометр.
**10.05** «Знакі лёсу». Дак. драма (16+).
**10.35** Дэтэктыў «Жанчына з катом і дэтэктывам» (12+).
**12.35** Суд вырашыць (16+).
**13.40 Серыял «Спаская-3» (16+).**
**15.55** Нічога сабе ньюз (12+).
**16.00** «ПІН_КОД» (12+).
**17.00** «Абмен дамамі» (16+).
**18.20** «Кароль дэсертаў. Кубак Агзамава» (12+).
**19.40** «Азбука «Уральскіх пельменяў» (16+).
**21.10** Спортлато 5 з 36, КЕНА.
**21.15 Дэтэктыў «Маскоўскія таямніцы. Праклён майстра» (16+).**
**23.10 Баявік «Хуткасць. Аўтобус 657» (16+).**







## 8 канал

**7.00** «Надвор'е» + «Эра-на».
**7.05** Мультпарад.
**7.25** «Дзеці аб ежы».
**7.45, 15.35** Камедыя «Медыум» (12+).
**9.30, 12.10** Серыял «Код доступу» (16+).
**11.15** «Дак. экран».
**13.55** «Гатуй як шэф».
**14.05, 21.20** «Любімае кіно».
**15.25** «Прыколы 13-й школы» (6+).
**17.20** Драма «На подступах да Масквы» (12+).
**19.05, 21.00** «Надвор'е».
**19.10** «Вячэрні серыял».
**20.50** «Вечарніца».
**21.05** Урокі Лазуркіна».
**21.10** «Фэшн is my прафэшн» (12+).
**23.50** Серыял «Прафесія — ратавальнік» (16+).
**0.40** «Начны серыял».

## Культура

**6.30** «Пешшу...»
**7.05** «Першыя ў свеце». Дак. серыял.
**7.20, 18.30, 0.10** Ступені цывілізацыі.
**8.05** «Жыццё і лёс».
**8.25, 22.15** «Мегрэ». Тэлесерыял.
**10.00, 12.30, 16.30, 19.30, 23.55** Навіны культуры.
**10.15** «Назіральнік».
**11.10, 0.55** ХХ стагоддзе.
**12.45** Навіны. Падрабязна.
**13.00** Штучны адбор.
**13.45** «Абломаў». Тэлеспектакль.
**15.30** «Белая студыя».
**16.45** «Біблейскі сюжэт».
**17.15, 2.00** Равіль Ісламаў, Дзяржаўны акадэмічны сімфанічны аркестр Расіі імя Я. Ф. Святланава.
**18.10** Гістарычныя курорты Расіі.
**19.45** «Галоўная роля».
**20.05** Жыццё выдатных ідэй.
**20.30** «Добрай ночы, малыя!»
**20.45** «Настаўнік года Расіі — 2024».
**21.30** «Абсалютны слых».

## Настальгія

**6.00** «СеўАлогія» (18+).
**7.00** «Ісус Хрыстос Суперзорка» (16+).
**8.45, 9.40, 11.35, 15.40, 17.30, 20.35, 21.40, 23.30, 0.40, 3.40, 5.30** Музычная настальгія (12+).
**9.00, 15.00, 21.00, 3.00** «Мінулы час» (12+).
**10.00, 16.00, 22.00, 4.00** «Народжаныя ў СССР» (16+).
**11.00, 17.00, 23.00, 5.00** «Блеф-клуб» (16+).
**12.00** «Быў час» (16+).
**12.50** Маст. фільм «Вязень крэпасці Зенда» (16+).
**14.30** Дак. фільм «Да і пасля трох секунд» (12+).
**18.00** «Спяем, сябры!» (16+)
**18.55** Маст. фільм «Такія розныя лёсы» (18+).
**0.00** Дак. фільм «Два жыцці Леаніда Брэжнева» (16+).
**0.50** «Гумар, які мы страцілі (Гумар савецкай эпохі)» (16+).
**1.35** «Сто пытанняў да дарослага» (16+).
**2.15** Дак. фільм «Даліда. Бывай, каханне, бывай...» (16+)

## EuroSport 1

**3.00, 7.00, 11.30, 14.00** Веласпорт. Цюрых. Мужчыны (16+).
**4.00, 8.00, 12.35, 21.00** Снукер (6+).
**6.00, 10.30** Веласпорт. Цюрых. Жанчыны (16+).
**9.30** Сёрфінг (6+).
**15.00, 2.00** Веласпорт. Цюрых. Мікст.
**19.05** Скалалажанне. Мужчыны BOULDER (0+).
**20.00, 1.00** Конны спорт (6+).

## Кінакамедыя

**1.00** «Прыгажунчык-2» (18+).
**4.00** «Пекла пекла» (18+).
**5.40** «Вяселле лепшага сябра» (12+).
**7.35** «Астэрыкс на Алімпійскіх гульнях» (16+).
**9.50** «Я худзею» (16+).
**11.50** «Прыгажунчык-2» (18+).
**14.15** «Таксі» (16+).
**15.55** «За Палыча!» (12+)
**17.45** «Таксі-3» (16+).
**19.30** «Парыж. Усё ўключана» (18+).
**21.40** «Непрыстойныя госці» (18+).
**23.15** «Ілюзія падману» (16+).

## ТБ3

**6.00** Калекцыя «Беларусьфільма» (12+).
**9.45** «Містычныя гісторыі» (16+).
**10.45** «Глядзі сам» (16+).
**11.00, 16.40** «Каралёк — птушачка пеўчая» (16+).
**12.45, 18.30, 3.15** «Сляпая» (16+).
**14.10, 19.55, 3.40** «Варажбітка» (16+).
**15.45** «Пятая варта» (16+).
**21.30** «Сельскі дэтэктыў» (16+).
**23.20** «Ганна-дэтэктыў» (16+).
**0.20** «Дзённік экстрасэнса» (16+).
**1.10** «Леон» (16+).
**4.30** «Суд ідзе». Дак. серыял (16+).

## ТБ1000

**6.25, 7.20, 23.10, 0.05** Чыста англійскія забойствы (16+).
**8.20** Серэна (16+).
**10.25** Дзяржфорд-парк (16+).
**13.15** Акадэмія вампіраў (16+).
**15.15** Рэальныя ўпыры (16+).
**17.00, 5.00** Алекс і Эма (16+).
**19.00** Лісты да Джульеты (16+).
**21.05** Вялікія вочы (16+).
**1.05** Візантыя (16+).
**2.55** Іншыя (16+).
**4.40** Том, які гаворыць, і сябры (6+).

## ТБ1000 Рускае кіно

**5.30** Маша і Мядзведзь (кліпы) (6+).
**5.55** Атэль у авечак (6+).
**6.50** Сволачы (16+).
**8.45** 9-я рота (16+).
**11.25** Свет (16+).
**13.40** Спадарожнік (16+).
**15.50** Балканская мяжа (16+).
**19.00** Цень. Узяць Гардзея (16+).
**20.45** Параграф 78: фільм першы (16+).
**22.30** Параграф 78: фільм другі (16+).
**0.10** Заселены востраў (16+).
**2.15** Заселены востраў: Сутычка (16+).
**3.55** Тэлекінез (18+).

## ЯСНАе

**4.55** Серыял «Майстар і Маргарыта» (12+).
**6.40** Серыял «Мужчынская работа-2» (12+).
**8.15** «Раніца ЯСНАя».
**9.20** Серыял «Рускі пераклад» (16+).
**11.15** Маст. фільм «Чорны сабака. Паперажальны ўдар» (16+).
**13.05** Серыял «Брат за брата-2» (16+).
**14.45** Серыял «Шэф. Вяртанне» (16+).
**16.30** Футбол. Беларусбанк — чэмпіянат Беларусі. «Нафтан-Наваполацк» — «Нёман» (Гродна).
**18.30** Серыял «Гарачая кропка-2» (16+).
**20.10, 21.25** Серыял «Сляпы-2» (12+).
**21.00** Дак. цыкл «Сувязісты».
**22.15** Серыял «Смяротная сутычка» (12+).
**23.50** Маст. фільм «Палігон» (12+).
**2.00** Маст. фільм «Парашуты на дрэвах» (12+).
**4.15** Маст. фільм «Годны да нестраявой» (12+).

## ЗВЯЗДА

**6.00** «Друкаваны фронт. Газеты стралялі ва ўпор». Дак. фільм (12+).
**6.30** «Азарычы. Ахвяры «Эскулапа». Дак. фільм (12+).
**7.00, 19.30, 23.00** «Навіны».
**7.20** «Рубікон».
**7.30, 13.25** «У лясах пад Ковелем». Маст. фільм (12+).
**8.45, 21.35** «Варыянт «Амега». Маст. фільм (12+).
**10.00, 10.50, 17.50, 18.40** «Разведчыцы» (16+).
**11.40, 12.30, 19.50, 20.40** «Канвой PQ-17» (12+).
**14.35, 15.20** «Чырвоная капэла» (12+).
**16.05, 0.45** «22 чэрвеня. Асуджаны свет». Дак. фільм (12+).
**16.45** «Маршал рэвалюцыі». Маст. фільм (12+).
**19.45, 23.15** «Навіны ў форме».
**22.45, 3.45** «Непадзельныя». Дак. фільм (12+).
**23.20** «Сяргей Вайцяхоўскі. Генерал без Радзімы». Дак. фільм (12+).
**0.15** «Шпіён з-пад Вілейкі». Дак. фільм (12+).
**1.15** «Горад, які паўстаў з попелу». Дак. фільм (12+).
**1.45** «Хатынь. Засакрэчаная трагедыя». Дак. фільм (12+).
**2.15** «Бабруйскі вузел. Ліквідацыя». Дак. фільм (12+).
**2.45** «Вайна разведак. Курсанты асаблівага прызначэння». Дак. фільм (12+).
**3.15** «Контрразведка. Рассакрэчаны фронт». Дак. фільм (12+).

*У праграме магчымыя змяненні.*
*Перадрукоўка праграмы забароненая.*
*[СЦ] – фільм трансліруецца са скрытымі субцітрамі.*




## «НАЦЮРМОРТ» ДЛЯ КАХАНАЙ

...Час дзеяння — канец сямідзясятых, месца дзеяння — Мінск, інтэрнат БДУ на вуліцы Кастрычніцкай.

У нашым пакоі — апроч мяне, учарашняга школьніка — два замежнікі (з Мадагаскара і Афганістана) і Саша К. з Магілёўшчыны.

Да паступлення ў ВНУ ён паспеў адслужыць у войску і папрацаваць на Бабруйскім шынным заводзе — быў, карацей, чалавекам бывалым і досыць практычным... Гэта па яго прапанове мы выrашылі заняцца гаспадаркай: у першы ж дзень купілі чайнік, кубкі, патэльню, каструлю... Па чарзе, па вечарах (бо снедалі, абедалі ў студэнцкай сталоўцы) сталі нешта сабе гатаваць: смажыць бульбачку з цыбуляй на вясковым сале, варыць нейкі суп ці булёнчык...

І тым самым на знаёмы, на звычны водар у пакой да сябе прываблівалі гасцей. Не паспеем, бывала, з кухні прыйсці, прынесці тую ж патэльню з бульбай ды паставіць на стол, як чуецца стук у дзверы:

— Можна пазычыць канспект? — просіць адзін.

— А іголка з ніткай ці ёсць? — пытаецца другі.

— Сходзім у кіно? — прапаноўвае трэці.

Яны вось так жартавалі, а Саша, хлопец праставаты і мешкаваты, усё за чыстую праўду прыняў: схадзіў у краму, з кілаграм той цыбулі ўзяў.

Да яе ля «Падковы» (крамы на вуліцы Кірава), па падказцы тых самых сяброў, купіў у вясковых бабуль пятрушкі і кропу. У суседнім пакоі пазычыў вялізнай талеркі і...

Ці не з гадзіну перад прыходам Алачкі Саша цудадзейнічаў, займаўся «ювелірнай» работай: чысціў тую дробную рыбку, выкладваў з яе паўкруг і сэрцайка ў цэнтры талеркі, як мог, аздабляў свой «нацюрморт» галінкамі кропу і пятрушкі, тонкімі колцамі парэзанай цыбулі...

Пах стаяў — на ўвесь пакой!

— Ну ўсё — пасля такога пачастунку Алачка ўжо твая! — абнадзейвалі Сашу сябры-аднакурснікі. — Толькі ж ты не варонь — будзь смялейшым!

Хлопец якраз так і збіраўся.

У чаканні каханай госці ўсіх адпанакойнікаў ён адправіў у кіно, сам старанна памыўся, прычасаўся, пагаліўся, надзеў новыя шкарпэткі і найлепшую кашулю...

У прызначаны час расчыніў перад Алачкай дзверы, павітаўся, запрасіў да стала.

— Дзякуй, Саша, — сумелася дзяўчына, убачыўшы там «рыбную талерку». — Я толькі што паела... Давай лепш на вуліцу пойдзем. Я табе вершы свае пачытаю.



Валянцін ГУБАРАЎ. **Анёлы любяць каўбасу.**

Мы з Сашам — як нічога ніякага: давалі, пазычалі, адказвалі, а заадно запрашалі да стала.

Праўда, гэта было спачатку. Потым Саша прыкінуў даходы-расходы — зразумеў, што візіцёраў усіх не пракорміш, і таму неўзабаве, прынёсшы ў пакой патэльню, стаў і за замыкаць за сабою дзверы і на стук (пра мабільнікі нават куры яшчэ не шапталі) гучна адказваць:

— Я заняты. Зайдзіце праз паўгадзіны.

...Хлопцы аднойчы зайшлі раней.

Як гэта атрымалася, расказалі самі.

Значыць, пазнаёміўся, пасябраваў Саша з Алачкай — пачынаючай паэткай, прыгажуняй-філфакаўкай — вырашыў запрасіць яе ў госці. А папярэдне стаў раіцца, чым жа такую госцю лепей пачаставаць.

Першая думка ў яго:

— Можа, торцік ці пірожных купіць?

— Не... Хіба здурнеўшы, — сталі даводзіць яму сябры. — Дзяўчаты ж цяпер баяцца папраўіцца, з розных дыетах сядзяць... Так што салодкае ім навет не паказвай — пакрыўдзяцца, прымуць за нейкі здзек... А вось рыбцы салёненькай будуць рады. У нашым гастраноме цюлька прадаецца. Тлустая такая, смачная — пальчыкі абліжаш!

...Колькі іх было, гісторыя замоўчвае.

Факт, што праз гадзіну-другую Саша вярнуўся ў пакой і заспеў там сваіх дарадцаў.

На талерцы з цюлькай яны пакінулі толькі хвосцікі.

**Віктар Сабалеўскі,**
*г. Узда.*

## НЕ АДЗЕЖА ЗДОБІЦЬ ЧАЛАВЕКА, А ЧАЛАВЕК — АДЗЕЖУ

...Так атрымалася, што ў гэтых дваіх, Святланы і Максіма, за два гадкі нарадзілася двое дзетак — хлопчык і дзяўчынка.

Маладая матуля, зразумела ж, працаваць не магла — сядзела дома з малымі. Грошы зарабляў толькі бацька.

На што іх магло хапіць? На самае неабходнае.

Але ж яны прыстасаваліся, жылі і ўсё б нічога, калі б не, мякка кажучы, вялікая радня Максіма, калі б у ёй не жалезны закон пастаянна з'язджацца — збірацца то да некага на вяселле, то на хрэсьбіны, то на юбілей ці выправы... Запрашалі, склікалі гасцей, і ніхто не пытаўся, ёсць у цябе грошы ці не — адкладвай справы, рыхтуй падарунак, прыбірайся...

У Святланы яшчэ і з гэтым праблема была: у старых, дзявочых сукенкі пасля родаў не ўлазіла, новыя спраўляць не было за што, а тут, як на ліха, — чарговае запрашэнне і загад радні: ехаць трэба.

Трэба дык трэба. Святлана ў свае дваццаць два ўмела шыць — і сукенкі, і блузкі са спадніцамі, і адзенне дзеткам. У той раз проста не было з чаго: купіш тканіну — не застанецца грошай на падарунак, купіш падарунак...

Залазіць у даўгі яна не хацела.

— Слухай, а памерай маю новую кашулю, — неяк прапанаваў Максім. — Гэта ж «твой любімы памерчык», як казаў Папандопула.

Святлана дастала абноўку з шафы (сама купляла — прыгожая, ні разу яшчэ не надзетая), ускінула на плечы, пакруцілася перад люстэркам... Якраз: і па фігуры, і да твару... Выцягнула любімую чорную спадніцу, якую можна было распусціць па швах... Здаецца, выйсце?!

Адно бянтэжыла: кашуля была мужчынская — няўзброеным вокам відаць!

У той момант, калі Света ў роспачы збіралася заплакаць, за парог ступіла суседка Лідзія Іванаўна, убачыла яе і ўсё зразумела: схадзіла дамоў, прынесла васільковую трыкатажную кофтачку-безрукаўку.

— На, надзявай! — загадала Святлане і, убачыўшы, як пасуе, сама засвяцілася ад радасці:

— Каралеўна!.. Далібог! Смела едзь на вяселле, смела гуляй! Ні на кога не глядзі — роўных табе не будзе! І за малых не хвалюйся: мы з бабуляй дагледзім.

...Людзей на вяселлі было без ліку! Усе прыбраныя, а ўжо маладзіцы... У доўгіх вечаровых сукенках, з залатымі пярсцёнкамі-ланцужкамі, з моднымі прычоскамі...

Света паспела расстроіцца, падумаць, што гэта яны каралеўны, але ж тут у клуб зайшлі музыканты і ўрэзалі такую вясёлую полечку, што ногі самі запрасіліся ў скокі!

Максім, на жаль, танцаваць не ўмеў, а вось яго стрыечны брат Мікола...

Зглядзеў ён Святланін настрой, падхапіў, закружыў — у полечцы, потым — у вальсе... Ды так, што яна зусім забылася і аб тым, што папаўнела, і аб тым, як сціпла прыбралася... На іх (і, вядома ж, на яе!) былі скіраваныя позіркі гасцей, яна і Мікола пасля кожнага танца зрывалі апладысменты.

...Прыехаўшы дамоў, Света адразу ж збегала да суседкі, з удзячнасцю аддала безрукавачку, са смехам расказала, як весела пагулялі.

І як злавалі яе залвіцы, што ў новых дарагіх сукенках і золаце ледзь не ўсё вяселле прастаялі ля сцен вясковага клуба. Танцаваць — так, як Святлана — ніводная з іх не ўмела. Ды і потым не навучылася.

**В. Бабко-Аляшкевіч,**
*Салігорскі раён.*

**Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.**

***Ад яе ж*** *мо не лішні напамін: усе «вясёлыя і праўдзівыя гісторыі» на старонках «Звязды» не проста друкуюцца — яны ўдзельнічаюць у конкурсе на найлепшую.*

*Для таго, каб іх вызначыць, працуюць два журы — малое рэдакцыйнае і вялікае чытацкае, у склад якога можа ўвайсці кожны, хто цягам года будзе чытаць усе змешчаныя гісторыі (у дапамогу — бібліятэкі альбо сайт «Звязды»: калейдаскоп, «Алё, народ...») ды нейкім чынам пазначаць, выразаць, адкладваць, запісваць тое, што спадабалася — з тым, каб бліжэй да Каляд перачытаць (напэўна, яшчэ раз?), выбраць дзясятку найлепшых і пералік даслаць у рэдакцыю.*

*Творы, якія набяруць максімальную колькасць галасоў, выйдуць у лідары — з усімі адсюль наступствамі...*

Неасабісты суб'ектыў



# ЯБЛЫЧНАЯ ІМПРЭСІЯ,
## або «Журавінка» назаўжды

АДСУТНАСЦЬ бульбяных градак у вёсцы сёлета кампенсуецца наяўнасцю старога яблыневага саду. У чым тут паралелі, спытаеце? Проста сёлета збіраць апалыя яблыкі — тое самае, што бульбу за «тэкам». Ведаеце, што такое «тэк»? Навясная бульбакапалка да трактара, якая захоплівае дзве градкі і пакідае за сабой паласу перарэсенай зямлі і россып бульбы на ёй, — капаца ў зямлі не трэба, толькі збірай. Не ведаю, наколькі гэты цуд тэхнікі папулярны ў 20-х гадах XXI стагоддзя, а ў 80-я—90-я дваццатага быў і на калгасных, і на прысядзібных палетках вяскоўцаў вельмі распаўсюджаны. У нашай мясцовасці нават дзеяслоў адмысловы з'явіўся — «тэкаць», «растэкаць», што вельмі весяліла мужа маёй сястры, які быў родам з-пад Баранавічаў, дзе гэткіх неалагізмаў не было.

ДЫК вось, сёлета яблыкаў на зямлі ў садзе — як бульбы ва ўраджайны год на растэканых градках: збіраеш не разгінаючыся, і фінішу не відаць. Асабліва калі прыязджаеш толькі на выхадныя — за тыдзень іх нападае столькі (сказаў бы: яблыку няма дзе ўпасці, але будзе тут не вельмі дарэчы, хаця і па сутнасці). Розніца з капаннем бульбы сапраўды невялікая, толькі што яшчэ блытаешся ў зусім нядаўна пакошанай, але ад такога нечаканага цяпла хутка падрослай траве. Збіраеш, як і бульбу, у два кашы — прыгожыя, крамяныя, амаль не папсаваныя — сабе ды сябрам-знаёмым на пачастунак, цэлыя, але з выгляду горшыя, больш дробныя, зеленаватыя — на пачастунак свінкам мясцовага фермера. Ён спецыяльна раздае мяшкі, і пасля выхадных ля многіх брамак на вуліцы стаяць па дзве-тры напоўненыя яблыкамі нашулкі. Ён пасля ездзіць і закідвае іх у свой джып... Асобна стаіць у садзе тачка, па-нашаму — каламажка. У каламажку ляціць уся «некандыцыя» — моцна пабітыя, гнілыя. Гнілых сёлета асабліва шмат — штрыфель і нават антонаўкі не вытрымалі гарачага і мокрага лета...

СПАЧАТКУ ад гэтага занятку атрымліваеш задавальненне і нават асалоду — удыхаеш водар антонавак, раз-пораз адкусваеш ад якога яблыка асабліва прываблівы спелы бачок. Але калі праз паўтары гадзіны фермерскія мяшкі пад завязку поўныя, сабе ўжо насыпана з запасам, суседка назбірала колькі хацела, ты штурхаеш перад сабой ужо сёмую ці восьмую поўную цяжкую каламажку і бачыш, што яшчэ трэба пазбіраць пад дзвюма яблынямі, — тут ужо не да асалоды і не да задавальнення. Баліць спіна, кружыцца галава — карацей, збіраць яблыкі ў яблычны год — надзвычай цяжкая праца, скажу я вам. У каламажку ўжо ляцяць усе без разбору — не пазбіраць іх нельга, бо закісліўся і без таго кіслую ў нашых мясцінах глебу, і тады ў садзе будзе расці суцэльная крапіва. За плотам ужо насыпаны добры такі капец, які за зіму проста згніе. Шкада, канешне, але ж дзяваць гэты багацюшчы сёлета ўраджай проста няма куды.

РАНЕЙ з гэтым праблем не было. Па-першае, у хляве была скаціна, якой яблыкі былі добрым прыкормам. Карове іх наразалі на кавалкі, сыпалі ў яслі. І малако было ўвосень з адчувальным водарам антонавак. Свінням іх секлі секачом у карыце, прысыпалі ржаной мукой, і дзюдзі з апетытам іх хрумкалі, трасучы вялікімі вушамі. Салодкімі штрыфелямі частавалі навет курэй, тыя ахвотна дзяўблі здробненую мякаць... Па-другое, на вёсках ездзілі нарыхтоўшчыкі. За яблыкі плацілі літаральна капейкі, але ж і здавалі іх дзясяткамі, навет сотнямі кілаграмаў. На некалькі пачкаў цукру зарабіць можна было, усё ж не задарам... Ну і па-трэцяе, у кожнага гаспадара, які сябе паважае, была сокавыціскалка «Журавінка»...

Гэты несмяротны агрэгат перамолваў усё, што засоўвалася ў яго вузкае рыльца і падпіхвалася спецыяльным «таўкачыкам». Апарат з пяшчотнай назвай натужна рыкаў, выдаваў гук, вельмі падобны на гук піларамы, — і з аднаго боку пачынаў паціху капаць рудаваты сок, з іншага, калі зрушыць адмысловы рычажок, выварглаcя гэткая самая рудаватая макуха. Яе дробнымі шматкамі ў рэшце рэшт было запырскана ўсё — і сцены, і столь, і ўсе, хто знаходзіўся ў радыусе дзеяння цуда-тэхнікі.

Соку цiснулі шмат — «Журавінка» нястомна вішчала на кухні некалькі дзён. Піць яго свежавыцiснутым было немагчыма: вельмі кіслы. Хіба што развесці гатаванай вадой і падсаладзіць. Але з яго рабілі «квас», а па сутнасці, дамашняе лёгкае віно. Налівалі ў вялікія — дваццацілітровыя — шкляныя пузатыя бутлі, сыпалі крыху цукру, закаркоўвалі і ставілі ў склеп... Асаблівай папулярнасцю гэты лёгкі напой карыстаўся налета падчас майскіх работ на агародзе — мужчыны з задавальненнем наталялі ім смагу, нахадзіўшыся за плугам. Бралі яго з сабой і на касьбу, налівалі ў вялікі тэрмас, каб даўжэй заставаўся халодным. Мы, малыя, таксама некалькі разоў яго каштавалі, але, памятаю, рэзкаваты кіслы смак нам зусім не спадабаўся...

«ЖУРАВІНКА» кракталa і вішчала ў хаце кожную восень да сярэдзіны 90-х, пакуль жыла бабуля, пакуль трымалі вялікую гаспадарку. Яблычнае віно было для кабет, у якіх у хаце няма гаспадара, спосабам разлічыцца з мясцовымі мужыкамі за пакошаны двор ці ўзараны агарод. Пасля сокавыціскалка бясследна знікла, і пра яе ўжо ніхто не згадваў. Яблыкі неяк парадкавалі без яе, пасля купілі каламажку, і праблема вырашылася...

Тры гады назад рабочыя разбіралі стары хлеў. «Ты глянь, «Журавінка»!» — здзіўлена ўсклікнуў старэйшы. Яна была на вышках, пад слоем старога сена. Пажаўцелая, з паржавелым дыскам. Але — спраўная, хлопцы высветлілі гэта, уваткнуўшы ў разетку. «Ну вось, будуць яблыкі, пастаўлю віна», — прыгаворвала я, выціраючы ад гразі пузатую шкляную бутлю, якая дзіўным чынам таксама захавалася ў тым старым хлеве... Праўда, планы так і засталіся планамі. Зухаватыя хлопцы, атрымаўшы разлік, неўпрыкмет звезлі з сабой і бутлю, і «Журавінку», і новыя дзверы, якія стаялі ў тым жа хляве...

Я б, напэўна, той сок і не рабіла, але згадваю пажаўцелую сокавыціскалку, што нечакана з'явілася з мінулага жыцця, — і шчымлівая шкада. Ці то сялянская добрая сквапнасць гэта, ці то адчуванне «няма таго, што раньш было»?.. Зрэшты, няма часу самааналізам займацца — хутка выхадныя, а за тыдзень ізноў у садзе яблыку няма дзе ўпасці...

**Алена ЛЯЎКОВІЧ.**

## РУП «Институт недвижимости и оценки» (Гродненский филиал)

### информирует о проведении открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего открытому акционерному обществу «Гродногазстройизоляция»

**Аукцион состоится 21.10.2024 г. в 11.00 по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209. Телефон для справок 55-87-71**

| Лот № 1 | |
|---|---|
| Наименование, характеристика предмета аукциона, местонахождение предмета аукциона | **ЛОТ 1: грузовой седельный тягач MAZ 6422A8,** допустимая полная масса 24500 кг, свидетельство о регистрации СAA 252392, дата выдачи 24.03.2010, рег. знак АА 6830-4, номер кузова (рамы) Y3M6422A880000371, 2008 года выпуска, пробег автомобиля составляет 640298 км. Местонахождение автомобиля: **Гродненская область, Дятловский район, г. п. Новоельня, ул. Заводская, 7** |
| Начальная цена продажи | **ЛОТ № 1** – 13 380 (тринадцать тысяч триста восемьдесят рублей) с учетом НДС |
| Сумма задатка | **ЛОТ № 1 –** 1 338 руб. (одна тысяча триста тридцать восемь рублей) |
| Реквизиты для перечисления задатка | BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225 |
| Место, дата и время окончания приема заявлений | Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед с 12.30 до 13.18. **Последний день приема заявлений – 17.10.2024 г. до 15.00** |

Условия проведения аукциона:
1. Возмещение Победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) затрат Продавца по уплате вознаграждения организатору аукциона в размере 5 % от конечной цены продажи.
2. Возмещение Победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) затрат Продавца на оказание услуг по независимой оценке объекта продажи в размере 249,78 руб. с НДС за оценку 1 единицы техники.
3. Возмещение Победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) затрат Продавца на оплату услуг по проведению аукциона согласно акту сдачи-приемки выполненных работ от 28.06.2024 г. № 1 и протокола несостоявшегося аукциона от 28.06.2024 г. № 1 в размере 524,51 руб. с НДС.
4. Возмещение Победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) затрат Продавца на оплату услуг по проведению аукциона согласно акту сдачи-приемки выполненных работ от 03.09.2024 г. № 1 и протокола несостоявшегося аукциона от 03.09.2024 г. № 1 в размере 524,51 руб. с НДС

Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержится в информации о проведении аукциона, опубликованной на сайте Организатора аукциона – https://grino.by/auktsiony

## Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| Предметы аукциона | Начальная цена, руб. (без учета НДС) | Размер задатка, руб. |
|---|---|---|
| **Лот № 1:** капитальное строение с инвентарным номером 100/С-70546 (наименование: здание для откорма скота; назначение: здание специализированное животноводства) площадью 2047,6 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Брестский р-н, Радваничский с/с, 5, на земельном участке с кадастровым номером 121200000001027553 площадью 1,4951 га, составные части и принадлежности: два выгульных дворика, площадка для складирования навоза, водонапорная башня, артскважина, погрузочно-разгрузочная рампа стационарная с весами | 116 900,00 | 11 690,00 |
